№№184–185 (3314–3315)

23–25 лістапада 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ЧУЛІ?

Праваабаронца абскардзіў рэгістрацыю Лукашэнкі кандыдатам у прэзідэнты

*Праваабаронца, сябра Беларускага Хельсінкскага камітэта **Гары Паганяйла** падаў у Вярхоўны суд скаргу на рашэнне Цэнтральнай выбарчай камісіі аб рэгістрацыі Аляксандра Лукашэнкі кандыдатам у прэзідэнты.*

Гары Паганяйла нагадвае, што ёсць падставы меркаваць, што Аляксандр Лукашэнка не можа выконваць абавязкі прэзідэнта паводле стану здароўя, а таксама што ён нібыта датычны да незаконнага захопу ўлады ў Беларусі ў 1996 годзе. Цэнтрвыбаркам ведаў пра гэтыя сур'ёзныя перашкоды для рэгістрацыі, але не ўлічыў іх, мяркуе Гары Паганяйла.

Праваабаронца просіць Вярхоўны суд абавязаць ЦВК адмяніць сваё рашэнне аб рэгістрацыі Аляксандра Лукашэнкі, пакуль той не зняпраўдзіць гэтыя звесткі.

ДАРЭЧЫ

*Прадстаўнік Беларускага Хельсінкскага камітэта па Гродзенскай вобласці **Раман Юргель** таксама абскарджвае ў Вярхоўным судзе рашэнне Цэнтральнай выбарчай камісіі аб рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты грамадзяніна Лукашэнкі Аляксандра Рыгоравіча.*

Як высветлілася з фільмаў і тэлесюжэтаў, што былі паказаны па расійскім тэлебачанні, псіхічны стан здароўя дзейнага прэзідэнта Беларусі выклікае сумнеў у вядомых спецыялістаў, а гэта можа азначаць, што Лукашэнка не мае права балатавацца на пасаду кіраўніка дзяржавы. На думку Рамана Юргеля, Цэнтральная выбарчая камісія, не паставіўшыся належным чынам да зваротаў, якія былі накіраваны на яе адрас з патрабаваннем не рэгістраваць Аляксандра Лукашэнку, пакуль не будзе праведзены іх разгляд, па-ранейшаму маніпулюе дзейным заканадаўствам, з'яўляецца саўдзельнікам арганізацыі і ажыццяўлення далейшых дзеянняў Лукашэнкі і яго атачэння па ўтрыманні дзяржаўнай улады.

ВІЗІТ

Міністр Лаўроў не будзе сустракацца з апазіцыйнымі кандыдатамі

Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў, які прыбыў у Мінск учора позна вечарам, не плануе сустракацца з апазіцыйнымі кандыдатамі ў прэзідэнты.

Сёння адбудзецца сумеснае пасяджэнне калегій МЗС Беларусі і Расіі з удзелам Лаўрова і яго беларускага калегі Сяргея Мартынава. Затым абодва міністры возьмуць удзел у цырымоніі афіцыйнага адкрыцця Расійскага цэнтра навукі і культуры па вуліцы Ракаўскай.

Як паведаміў на мінулым тыдні прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных, падчас пасяджэння члены калегій разгледзяць пытанні, звязаныя з дзейнасцю міжурадавых інтэграцыйных аб'яднанняў на прасторы СНД.

"Высокапастаўленыя прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса дзвюх краін абмяркуюць праблематыку ўзаемаадносін з Еўрапейскім Саюзам і ход падрыхтоўкі да чарговага саміту АБСЕ", — паведаміў прэс-сакратар.

Някляеў патрабуе дадатковага эфіру

Кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў звярнуўся з афіцыйным запытам у Цэнтральную выбарчую камісію па правядзенні выбараў і рэферэндумаў Беларусі.

Палітык патрабуе прадастаўлення дадатковага эфірнага часу для ўсіх зарэгістраваных кандыдатаў.

Някляеў прапанаваў ЦВК арганізаваць дадатковыя выступы на тэлебачанні і радыё. Патрабаванне Уладзімір Пракопавіч абгрунтаваў наступным чынам: "Пасля завяршэння афіцыйных выступаў утвараецца вялікая паўза, падчас якой кандыдаты ў прэзідэнты, апроч аднаго (*відавочна, маецца на ўвазе Аляксандр Лукашэнка. —* **Аўт.**) фактычна выбываюць з медыйнай прасторы", — сказаў ён.

Акрамя таго, кандыдат у прэзідэнты адзначыў, што "людзі за два тыдні могуць забыцца пра выступы кандыдатаў у прэзідэнты".

Апроч таго, у сваім звароце да ЦВК Някляеў патрабуе у перыяд з 6 па 18 снежня абмежаваць паказ Аляксандра Лукашэнкі на дзяржаўных тэлеканалах, каб забяспечыць роўныя магчымасці ўсім кандыдатам у прэзідэнты.

"Народная Воля" звярнулася да сакратара Цэнтральнай выбарчай камісіі Мікалая Лазавіка.

"Пакуль ніякага запыту ад Някляева мы не атрымалі, — сказаў Мікалай Іванавіч. — Дадатковы эфір? Дык і таксама ва ўсіх ёсць па два выступленні на радыё і тэлебачанні. Наўрад ці нешта дадасца ці зменіцца. Так што я думаю, што гэта ўсё..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Футбольны матч ператварылі ў перадвыбарную акцыю

У нядзелю 21 лістапада адбыўся матч 33-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе "Дынама" (Брэст) — "Белшына" (Бабруйск). Арганізатары гульні зладзілі незвычайную палітычную акцыю.

Суддзі і футбалісты абедзвюх каманд выйшлі на поле спарткомплексу "Брэсцкі" ў суправаджэнні хлопчыкаў і дзяўчынак. Усе дзеці былі апранутыя ў майкі сіняга, чырвонага і жоўтага колераў з партрэтам Аляксандра Лукашэнкі і надпісам "Наш прэзідэнт", паведамляе інтэрнэт-газета "Салідарнасць".

БОЛЬ БЕЛАРУСИ

110 «героев», благодаря которым Беларусь остается последней диктатурой Европы

Именно они согласились похоронить Верховный Совет 13-го созыва и войти в назначенный президентом парламент.

1. Азарченков Александр Михайлович
2. Александров Валерий Михайлович
3. Александрович Владимир Александрович
4. Алексеенко Геннадий Павлович
5. Ананьев Роман Владиславович
6. Аникеев Михаил Михайлович
7. Астапченко Юрий Леонидович
8. Бань Михаил Викторович
9. Бекиш Николай Иосифович
10. Белов Николай Адамович
11. Белькович Виктор Федорович
12. Биккинин Борис Степанович
13. Блюдник Антон Денисович
14. Бобков Анатолий Константинович
15. Бруцкий Виктор Павлович
16. Бурак Виктор Константинович
17. Вараницкий Григорий Гаврилович
18. Винокурова Мария Михайловна
19. Волженков Григорий Николаевич
20. Волков Анатолий Егорович
21. Ворошнин Владимир Николаевич
22. Вронский Георгий Михайлович
23. Гаргун Василий Степанович
24. Глуховский Леонид Викторович
25. Говорушкин Станислав Николаевич
26. Горбунов Олег Аркадьевич
27. Григорьев Владимир Викторович
28. Гуков Иван Маркелович
29. Драко Валерий Владимирович
30. Дубовик Николай Николаевич
31. Дудко Александр Михайлович
32. Дунич Николай Владимирович
33. Егоров Владимир Демьянович
34. Енко Евгений Николаевич
35. Жушма Петр Евгеньевич
36. Зайцев Павел Карпович
37. Зинченко Александр Николаевич
38. Игнатищев Руслан Михайлович
39. Калугин Петр Алексеевич
40. Камай Алексей Степанович
41. Карпиевич Николай Федорович
42. Кашкан Георгий Михайлович
43. Кебич Вячеслав Францевич
44. Козырь Александр Викторович
45. Койда Анатолий Яковлевич
46. Комяк Николай Михайлович
47. Конашук Иван Петрович
48. Коноплев Владимир Николаевич
49. Коротченя Иван Михайлович
50. Костян Сергей Иванович
51. Котляров Игорь Васильевич
52. Красуцкий Анатолий Викторович
53. Круговой Валерий Кадашевич
54. Крючков Валентин Петрович
55. Кузьма Анатолий Фомич
56. Кулаковский Юрий Александрович
57. Кулик Виталий Васильевич
58. Куцко Николай Васильевич
59. Кучинский Виктор Францевич
60. Лапковский Олег Михайлович
61. Лекторов Валерий Николаевич
62. Лившиц Семен Борисович
63. Липкин Валерий Федорович
64. Лозовик Николай Иванович
65. Лукьянович Василий Петрович
66. Лунович Аркадий Ефимович
67. Любовицкий Вячеслав Викторович
68. Малаховский Анатолий Егорович
69. Малофеев Анатолий Александрович
70. Малумов Юрий Георгиевич
71. Миколуцкий Евгений Петрович
72. Минич Валерий Владимирович
73. Мирголовский Геннадий Николаевич
74. Михадюк Виктор Аркадьевич
75. Пасечник Виктор Владимирович
76. Пашкевич Иван Иванович
77. Плетюхов Владимир Анестиевич
78. Побяржин Збышек Иванович
79. Погорельский Леонид Вячеславович
80. Полочанин Иосиф Николаевич
81. Почепко Константин Анатольевич
82. Прохорчик Сергей Николаевич
83. Рачков Леонид Власович
84. Римарчик Иван Сергеевич
85. Рожко Валентин Александрович
86. Розганов Александр Иванович
87. Розынко Петр Михайлович
88. Романовский Антон Алексеевич
89. Руденко Виктор Петрович
90. Руммо Олег Васильевич
91. Сакович Василий Андреевич
92. Самусева Валентина Михайловна
93. Свирид Александр Владимирович
94. Сечко Леонид Никонорович
95. Снегирь Михаил Валентинович
96. Соловьев Анатолий Михайлович
97. Сосонко Михаил Павлович
98. Телебук Нина Петровна
99. Тютюнов Анатолий Дмитриевич
100. Ходневич Татьяна Николаевна
101. Хрол Василий Петрович
102. Худая Мария Николаевна
103. Шаршунов Вячеслав Алексеевич
104. Шевцов Николай Михайлович
105. Шиманский Николай Николаевич
106. Шпаков Сергей Григорьевич
107. Шпилевский Александр Францевич
108. Юхимук Василий Феодосиевич
109. Якобсон Александр Серафимович
110. Янович Алексей Александрович.

(О трагедии, которая произошла в 1996 году, читайте на 3-й стр.)

Віктар Цярэшчанка абяцае цуд...

У тры разы знізіць курс долара паабяцаў кандыдат у прэзідэнты Віктар Цярэшчанка падчас перадвыбарнага выступлення на першым канале Беларускага радыё.

"Мы створым у краіне наймацнейшую нацыянальную валюту, зробім наш беларускі рубель свабодна канверсуемым, які расце да долара. Спачатку ён будзе тры рублі за адзін долар, і за пяць-сем гадоў, а то і раней, мы выйдзем да долара адзін да аднаго. Каму патрэбны будзе долар у нашай дзяржаве? Мы станем цывілізаванай краінай, якая асэнсавала сакрэт нацыянальных грошай, і рэальна пакажам свету новы эканамічны цуд", — заявіў Цярэшчанка.

Ён выказаўся за адмену платнага праезду для школьнікаў, бо *"гэта не толькі не дае даход дзяржаве, але і выхоўвае ў дзецях імкненне праехаць "зайцам"*. Цярэшчанка лічыць неабходным адмяніць плату за першую сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю.

Кандыдат паабяцаў таксама забяспечыць "клопат пра хворых на алкагалізм і наркаманію.

Карацей, абяцанняў было не проста шмат, але нават зашмат. Але цікава тое, што Цярэшчанка ўжо паабяцаў, што прапануе пасаду прэм'ер-міністра Аляксандру Лукашэнку. Падаецца, што калі б Лукашэнка з Цярэшчанкам маглі стварыць цуд, то даўно б яго стварылі. Ці не так?

Не пропустите!

Результаты жеребьевки эфирного времени выступлений по ТВ и радио кандидатов в президенты.

Выступления кандидатов будут проходить по 3 декабря в рабочие дни: по радио — с 6.10 до 7.10, по телевидению — с 19.00 до 20.00.

Дата	Радио	Телевидение
23 ноября	В.Некляев, А.Лукашенко	Н.Статкевич, Д.Усс
24 ноября	В.Рымашевский, А.Михалевич	А.Санников, Г.Костусев
25 ноября	Н.Статкевич, Д.Усс	Я.Романчук, В.Терещенко
26 ноября	А.Санников, Г.Костусев	В.Некляев, А.Лукашенко
29 ноября	Я.Романчук, В.Терещенко	А.Михалевич, В.Рымашевский
30 ноября	А.Лукашенко, В.Некляев	Д.Усс, Н.Статкевич
1 декабря	А.Михалевич, В.Рымашевский	Г.Костусев, А.Санников
2 декабря	Д.Усс, Н.Статкевич	В.Терещенко, Я.Романчук
3 декабря	Г.Костусев, А.Санников	А.Лукашенко, В.Некляев.

Также кандидаты в президенты по желанию смогут принять участие в дебатах, которые пройдут в прямом телевизионном эфире 4 декабря с 17.00 до 18.00 часов и по радио в такое же время 5 декабря.

«Народная Воля» служыць не ўладам і партыям, а сваім чытачам!

Таму, шаноўныя сябры, давайце быць разам і ў 2011 годзе.

*Падпіска на першую палову наступнага года ўступіла ў заключную фазу. Не спазніцеся! Нагадваем: Вас чакаюць ва ўсіх паштовых аддзяленнях, а мінчан — яшчэ і ў спецыялізаваных пунктах "Белсаюздруку". Нашы індэксы: для індывідуальных падпісчыкаў — **63222**, для прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, фірм — **632222**.*

Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!

P.S. Падпіска на снежань прымаецца па 26 лістапада ўключна. Не спазніцеся!

Ф. РП-1

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь

АБОНЕМЕНТ на газету 63 222 (индекс издания)

Народная Воля (наименование издания) Количество комплектов

на 2011 год по месяцам

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Кому (фамилия, имя, отчество)

Куда (адрес)

(почтовый индекс) (город, населенный пункт)

ДОСТАВОЧНАЯ КАРТОЧКА на газету 63 222 (индекс издания)

Народная Воля (наименование издания)

Стоимость: подписки руб., переадресовки руб. Количество комплектов

на 2011 год по месяцам

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Кому (фамилия, инициалы)

Куда (адрес)

(почтовый индекс) (город, населенный пункт)

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Ехалі да Лукашэнкі, а трапілі да беспрацоўнай

Днямі некалькі дзясяткаў чалавек наведалі грамадскую прыёмную кандыдата на пасаду прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, якая адкрылася ў Мінску. Яны спадзяваліся сустрэцца з дзеючым прэзідэнтам. Спадзяваліся, што іх выслухаюць і дадуць нейкі ход справам, якія людзі спрабуюць вырашыць гадамі.

Аляксандра Лукашэнкі ў прыёмнай не было. Ён не прыйшоў ні праз гадзіну, ні праз некалькі гадзін. У прыёмную літаральна на некалькі хвілін завітала даверанная асоба кандыдата — Аляксандр Радзькоў. Такім чынам, візіт быў марным. Хаця шмат хто прыехаў дзеля гэтай сустрэчы ў Мінск здалёк.

Людзі пачалі разам выказваць сваё абурэнне "Народнай Волі". Марыя Станіславаўна Капліна расказала: "Радзькоў адразу сказаў: "Чаго вы прыйшлі сюды?! Па якіх пытаннях?! Вы сытыя і апранутыя. Навошта прыйшлі?" А я яму адказваю: "Маю дачку забіў служачы, які адкупіўся за 50.000 долараў. Наркабарон... А дачка мая стала сведкай наркатрафіку, вось яе і забілі як сведку. Дык да каго мне ісці?" Я нічога ад іх не прашу, я толькі тры з паловай гады прашу расследаваць справу. Больш нічога!"

Мужчына, які прыехаў на прыём з Брэста, пацвердзіў, што Аляксандр Радзькоў агучыў папрок пра "сытых і апранутых". "Знайшоў чым папракаць, — абураецца ён. — Я ж хацеў у вочы паглядзець прэзідэнту, распавесці пра сваю справу..."

Людзі расказвалі, што ехалі спецыяльна, каб сустрэцца з Аляксандрам Лукашэнкам, патрацілі грошы на квіткі, узялі дзень за свой кошт на працы, а аказалася, што ўсё дарэмна.

Лілія Уварава прыехала з Гомеля: "Мы прыехалі, а тут сядзяць марыянеткі, якія нічога не вырашаюць, кажуць: "Можа, нехта будзе потым прымаць..." А нам Лукашэнка патрэбны, бо ўжо не дапамог ні генпракурор, ні старшыня Вярхоўнага суда. Мы хочам толькі аднаго — выканання закону. І няма да каго ісці з гэтым патрабаваннем, няма магчымасці да каго-небудзь дастукацца...

У той дзень людзей прымалі намеснікі начальнікаў аддзелаў з упраўлення юстыцыі і камітэта па працы Мінгарвыканкама.

Чаму спецыялісты, дзяржаўныя служачыя ў рабочы час не былі на сваім працоўным месцы, а ўдзельнічалі ў працы каманды аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты, засталося незразумелым. Самі юрысты патлумачылі, што знаходзіліся ў грамадскай прыёмнай у якасці запрошаных спецыялістаў. Ці прыйшлі б яны на прыём даваць кваліфікаваныя парады людзям у нейкую іншую грамадскую арганізацыю ці ў выбарчы штаб іншага кандыдата?.. Ці аплачваецца працоўны дзень, калі яны сёння не на працы? Гэтыя пытанні засталіся без адказу.

Кіраўніца аддзела прававога забеспячэння ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алена Лукашэвіч толькі патлумачыла:

— Я была на прыёме ў якасці запрошанай асобы ад дзяржаўных органаў. Пры чым тут ініцыятыўная група кандыдата? Абмяркоўвайце гэта з кіраўніком грамадскай прыёмнай. У мяне ёсць даручэнне майго кіраўніцтва, і я яго выканала. Чаму вас гэта цікавіць?

— А калі вас запросяць у грамадскую прыёмную да нейкага іншага кандыдата ў прэзідэнты, вы таксама пойдзеце кансультаваць грамадзян? Чаму вы сюды прыйшлі, а да іншых не пойдзеце?

— Ну... Магчыма, былі пытанні, якімі кіраўнік прыёмнай не валодаў. У дадзеным выпадку Радзькоў...

Падчас прыёму грамадзян адна жанчына, Людміла Чуева, прызналася, што яна беспрацоўная. Чаму вядзе прыём грамадзян? Таму што сябра "Белай Русі".

Вось так: людзі ехалі да Лукашэнкі, а трапілі да беспрацоўнай... І ўсё паказвалі і паказвалі ёй свае паперкі — ліставанне з пракуратурай, заключэнні экспертаў, акты будаўніцтва і г.д. У адказ чулі толькі адно: "Патэлефануйце праз тры дні", "Схадзіце на прыём у Міністэрства юстыцыі", "Звяртайцеся пазней"...

Калі пазней? Пасля выбараў?

Любоў ЛУНЁВА.

Пахаладае...

Тэмпература паветра 23 лістапада на працягу сутак будзе вагацца ад 1 градуса марозу ў паўночна-ўсходніх раёнах да плюс 6—8 градусаў на поўдні краіны. А 24 лістапада на тэрыторыю Беларусі пачне распаўсюджвацца халоднае арктычнае паветра. На працягу сутак тэмпература паветра складзе ад 5 градусаў марозу ў паўночных раёнах да плюс 5 градусаў на паўднёвым усходзе. Дажджы будуць змяняцца снегам. Месцамі чакаюцца моцныя ападкі. У асобных раёнах магчыма мяцеліца.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
23—25 ЛІСТАПАДА 2010 г.

РАЗВІТАННЕ

«Ён з постацяў, якія незаменныя...»

У аўтакатастрофе пад Маладзечнам загінуў вядомы навуковец, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Іван Нікітчанка.



Іван Нікітчанка нарадзіўся 10 студзеня 1939 года ў Бранскай вобласці. Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут (1960), доктар сельскагаспадарчых навук (1979), прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі (з 1986). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1982).

У першай палове 1990-х гадоў уваходзіў у склад ценявога кабінета Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце 12-га склікання. Доўгія гады ўзначальваў арганізацыйныя камітэты па правядзенні "Чарнобыльскага Шляху". Апошнім часам узначальваў сацыяльна-экалагічнае грамадскае аб'яднанне "Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў".

"Калі б сэрца было больш здаровым, былі шанцы яго выратаваць, — выказваў сваё меркаванне сын Івана Мікалаевіча, Юрый Нікітчанка. — Ён не жыў для сябе, жыў для іншых. Ахвяраваў сябе краіне".

...Іван Нікітчанка быў чалавекам, які нёс свайму народу праўду пра Чарнобыль. Не маўчаў у першыя дні трагедыі і зараз, калі на дзяржаўным узроўні тэму чарнобыльскай трагедыі пачалі замоўчваць. Нікітчанка проста і даходліва расказваў беларусам, як адбіваюцца на нашым здароўі наступствы самай жудаснай аварыі XX стагоддзя. Ён аб'ехаў з адмысловымі прыборамі, якія замяраюць радыяцыю, 24 рэгіёны Беларусі і прыйшоў да высновы, што ў Беларусі не засталося раёнаў, дзе б людзі не мелі "хранічную радыяцыйную дозу". А гэта небяспечна тым, што "імунная сістэма слабее і людзі робяцца безабароннымі перад любымі небяспечнымі фактарамі", пісаў Нікітчанка. Ён дамагаўся, каб на дзяржаўным узроўні ажыццяўлялася мерапрыемствы па радыяцыйнай абароне насельніцтва.

Як навуковец Іван Нікітчанка выступаў супраць будаўніцтва АЭС на тэрыторыі Беларусі. Апошнім часам узначальваў Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў.

— *Іван Мікалаевіч — чалавек унікальнага спалучэння кампетэнтнасці, навуковай глыбіні і грамадзянскай адказнасці,* — узгадвае экс-старшыня Партыі БНФ **Вінцук Вячорка.** — *Ён усведамляў, што ўратаваць краіну ад чарнобыльскай бяды немагчыма, калі краіна несвабодная, калі людзі несвабодныя, калі ўлада замоўчвае ад людзей сапраўдную інфармацыю. Будучы членам-карэспандэнтам НАН Беларусі, вядомым навукоўцам, чалавекам, які знаходзіўся на кіруючых пасадах, ён не баяўся ўзначальваць арганізацыйныя камітэты "Чарнобыльскага Шляху". Хаця, безумоўна, усведамляў, што гэта магло пацягнуць у юрыдычным і нават у фізічным сэнсе. Ён прайшоў чарнобыльскую зону, на сабе спазнаў усё, што нясе радыяцыя арганізму чалавека, пераадольваў гэтыя хваробы. І вельмі балюча, што так не ў пару Іван Мікалаевіч адышоў ад нас. Яго будзе не хапаць Беларусі. Ён з постацяў, якія незаменныя".*

... Аўтакатастрофа, у якой загінуў Іван Нікітчанка, адбылася днём 19 лістапада пад Маладзечнам. Навуковец ехаў на лецішча. Здавалася б, бачнасць на дарозе была добрая. Але ж... Па словах дзяжурнага АУС Маладзечанскага райвыканкама Мінскай вобласці Юрыя Выдрука, машына "Фольксваген-Джэта", якой кіраваў Нікітчанка, выехала на паласу сустрэчнага руху і сутыкнулася з аўтамашынай "ЗІЛ". Пацярпеў у аварыі толькі Іван Нікітчанка. Яго паспелі даставіць у Маладзечанскую гарадскую бальніцу. Але, не прыходзячы ў прытомнасць, ад атрыманай траўмы навуковец памёр ноччу 20 лістапада.

Развітанне з Іванам Мікалаевічам адбывалася учора, у яго невялічкай мінскай кватэры. Так вырашыла сям'я нябожчыка: правядзіць у апошні шлях мужа, бацьку і дзядулю з хаты, дзе ён жыў, а не з халоднай залы навуковай установы. Сярод тых, хто прыйшоў развітацца з Іванам Нікітчанкам, было шмат вядомых асоб, сярод якіх акадэмікі **Ігар Валатоўскі**, **Іван Шайко, Любоў Хатылёва, Аляксандр Вайтовіч,** прафесар **Сяргей Пятрушка**, мастак **Аляксей Марачкін**, рэжысёр **Валер Мазынскі**, кандыдаты ў прэзідэнты **Рыгор Кастусёў, Віталь Рымашэўскі, Андрэй Саннікаў**, лідар партыі "Справядлівы свет" **Сяргей Калякін**. Прыйшлі звычайныя беларусы, якія нават не былі асабіста знаёмыя з вучоным. Прыязджалі дэлегацыі з Калінкавічаў, Брэста... Дапамагаў у пахаванні Інстытут жывёлагадоўлі НАН Беларусі, у якім Іван Нікітчанка адпрацаваў 17 гадоў.

Івана Нікітчанку пахавалі на Паўночных могілках Мінска. Ён не дажыў да свайго 72-годдзя крыху менш за два месяцы.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Рада беларускай інтэлігенцыі з вялікім смуткам паведамляе пра трагічную смерць сябра Рады Івана Нікітчанкі. Чалавек, якога ведае ўся Беларусь, ён прайшоў шлях ад студэнта Віцебскага ветэрынарнага інстытута да члена-карэспандэнта Акадэміі навук, прафесара, лаўрэата дзяржаўнай прэміі СССР.

Ён быў адным з тых, хто яшчэ ў 1986 годзе, калі дзяржаўная цэнзура забараняла казаць праўду пра Чарнобыль, не пабаяўся папярэджваць людзей аб небяспецы. І ўсё сваё жыццё прысвяціў барацьбе з наступствамі аварыі на ЧАЭС, кіраваў Цэнтрам падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў. Нават калі адбыліся змены ў адносінах улад да чарнобыльскай праблемы, пачалі знішчацца і тыя, што былі, мізэрныя льготы для ліквідатараў, Іван Нікітчанка ў адрозненне ад шмат каго са сваіх калег, працягваў барацьбу за іх правы.

Як сябра Рады інтэлігенцыі, актыўна ўдзельнічаў у яе рабоце, падаючы прыклад мэтанакіраванасці і сілы волі. Меў сваю думку, але з павагай ставіўся да пунктаў погляду калег.

Мы смуткуем па ім — чалавеку вялікага інтэлекту, змагару і патрыёту.

Алена Анісім, Зінаіда Бандарэнка, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Аляксандр Вайтовіч, Анатоль Вярцінскі, Марат Гаравы, Радзім Гарэцкі, Валянцін Голубеў, Анатоль Гуляеў, Сяргей Законнікаў, Леанід Злотнікаў, Уладзімір Колас, Святлана Калінкіна, Аляксей Кароль, Георгій Ліхтаровіч, Алесь Марачкін, Пётра Садоўскі, Рыгор Сітніца, Наталля Сцяжко, Аляксандр Сядзяка, Юры Хадыка, Уладзімір Халіп, Юры Хашчавацкі, Лявон Цімохін.

Михалевич поменял руководителя штаба

Теперь штаб кандидата в президенты возглавляет политолог Игорь Драко.

Дело в том, что у бывшего руководителя инициативной группы Алексея Михалевича — Юрия Мелешкевича — 18 ноября родилась дочь, поэтому он, хотя и остается активным участником кампании, вынужден уделять больше времени семье и оставить занимаемый пост.

Игорь Драко родился в 1973 году, школу окончил в г.Ивье Гродненской области, выпускник Санкт-Петербургского государственного университета, работает на частном предприятии, которое занимается поставками, монтажом и пуско-наладкой отопительного оборудования. Неоднократно публиковался в газете "Народная Воля" и других независимых СМИ.

ПРОДАНО!

«Юнимилк» получил доступ к пяти заводам в Беларуси

Ведущий российский производитель молочной продукции и детского питания "Юнимилк" продолжает активно развивать бизнес в Беларуси.

Напомним, что "Юнимилку" с III квартала 2009 года в Беларуси принадлежат контрольные пакеты акций (51%) в СООО "Юнимилк Шклов" и СООО "Юнимилк Пружаны". Партнерами российской компании стали Шкловский маслодельный завод и Пружанский молочный комбинат, а также местные производители сырья. Предприятия на 99% являются экспортерами.

На Белорусском инвестфоруме во Франкфурте-на-Майне "Юнимилк" подписал инвестиционное соглашение с Минским облисполкомом о создании экспортоориентированного кластера по производству сыров и молочных консервов на базе ОАО "Слуцкий сыродельный комбинат" и активов ОАО "Слуцкий пивоваренный завод", говорится в сообщении "Юнимилка".

Общий объем инвестиций в проект составит порядка 80 миллионов евро в период до 2017 года. На мощностях модернизированного пивоваренного завода "Юнимилк" планирует выпускать до 200 млн банок молочных консервов в год. Модернизированные мощности сыродельного комбината позволят выпускать до 37 тыс. тонн сыра. Около 90% производимой продукции планируется поставлять на экспорт в страны СНГ.

Однако если о данных проектах было заявлено довольно громко, то приобретение "Юнимилком" завода в небольшом городке на Брестчине сопровождали лишь слухи, отмечает портал tut.by. Оказалось, что в конце сентября российская компания стала владельцем ИООО "ВыСоковое" (г.Высокое, Каменецкий район), выкупив у немецкой компании Leahg Holding 100% в уставном капитале предприятия. Сумму сделки в "Юнимилке" не озвучивают.

КАМАНДЗІРОЎКА

Кітайцы ўжо тут...

Паводле апошняга перапісу, насельніцтва Беларусі скарацілася за апошні дзясятак гадоў на 541 тысячу чалавек. За той жа час колькасць кітайцаў, якія пражываюць у Сінявокай, павялічылася ў дваццаць разоў.

Як чалавеку дапытліваму, мне проста свярбела пазнаёміцца з імі, зразумець, што пагнала звычайных людзей, а не якіх-небудзь авантурыстаў ці там міжнародных гандляроў, на край свету, у невядомае і нязвыклае асяроддзе. Наколькі яны адкрытыя ў зносінах, свабодныя ў выказваннях. І наогул, як ім тут жывецца... Канечне, прасцей за ўсё зкантактавацца з прыезджымі кітайцамі на рынку альбо ў якой ВНУ ці на будоўлі. Але журналісцкі досвед падказваў: лепш за ўсё гутарку весці з тымі, хто не адарваны ад зямлі-карміцелькі, хто з яе і жыве. І, на маю радасць, такія кітайцы на Беларусі знайшліся: на Берасцейшчыне, у Пружанскім раёне...

Некалькі гадзін імклівай язды на паўднёвы захад, з'езд на Івацэвічы, яшчэ колькі вёрст — і вось яны, Пружаны. Гарадок на Мухаўцы нават на дождж не здаўся правінцыяльным, хутчэй наадварот — па-еўрапеску ўтульным і прыветлівым, асабліва ў цэнтры. Яшчэ даваенныя пабудовы, некалькі храмаў, помнікі старасвецкай архітэктуры, цудоўны парк... Словам, ёсць на што паглядзець і чаму падзівіцца. Але трэба кіраваць далей — у вёску Шчарчова, там якраз атабарыліся мае кітайцы. Гэтак бы і зрабіў, але пачало змяркацца. Ды і дождж-назола канчаткова размагніціў мае імпэты. Значыцца, пойдзем да мясцовых улад — у райвыканкам...

Якраз на гэты момант "вертыкаль" і тутэйшая грамадскасць абірала дэлегатаў на Усебеларускі сход: шанцаў пагутарыць з першымі асобамі амаль не заставалася. Ды і намеснік старшыні райвыканкама спадар Казак паведаміў, што кітайцы нібыта з'ехалі на радзіму, з'явяцца ўвесну. Але параіў звярнуцца да сваіх падначаленых. Маўляў, у іх усё выведаеш. І напраўду тыя падмаглі, далі патрэбныя звесткі...

Па-першае, як высветлілася, тут неўзабаве пачнуць рэалізоўваць сумесныя з кітайскай правінцыяй Ляонінь праекты на агульную суму ў 100 млн долараў. Дамоўленасці былі дасягнуты падчас візіту старшыні мясцовай "вертыкалі" Аляксандра Юркевіча — у складзе дэлегацыі ад Брэсцкай вобласці — у Паднябесную. Там і быў падпісаны пратакол аб намерах далейшага супрацоўніцтва з Кітаем. Напрыклад, дамовіліся аб будаўніцтве ў Пружанах цагельнага і кансервавага заводаў. Канчаткова вызначыліся, як будзе далей развівацца супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі. Зноў жа, прыйшлі да згоды, што кітайцы возьмуцца пастаўляць свае матэрыялы мясцоваму заводу радыёдэталяў. У тым, што праекты будуць рэалізаваны, няма ніякага сумнення, запэўнівалі раённыя чыноўнікі, перамовы ж вяліся на вельмі высокім узроўні. Іх бок прадстаўляў віцэ-мэр правінцыі, а Берасцейскі — пасол Беларусі ў Кітаі Анатоль Тозік. Кітайцаў вельмі зацікавілі праекты, асабліва па цагельным заводзе. Не дзіва, яны выведалі, што мясцовая гліна надта якасная, прыдатная для вырабу першакласнай цэглы. Спачатку планавалася вырабляць да 30 млн цаглін у год, але кітайцы маюць намер на парадак павялічыць магутнасці будучага прадпрыемства. Цяпер неабходна перагледзець праектную дакументацыю...

Ну а што па сельскай гаспадарцы?..

А вось тут пахваліцца асабліва няма чым. Так, у раёне ўжо другі год працуе кітайскае (са 100-працэнтным капіталам) сельгаспрадпрыемства "СінаБелАгра", але без відавочных поспехаў. І тое прызнае галава раёна, старшыня райвыканкама Аляксандр Юркевіч. Чаму так?..

Па-першае, поўная адсутнасць сучасных тэхналогій, а адсюль мізэрныя аб'ёмы вырашчанай прадукцыі. Па-другое, слабая маркетынгавая служба, адсутнасць перапрацоўчага прадпрыемства, якое б выдавала паўфабрыкаты, а яшчэ лепш — цалкам перапрацоўвала вырашчаную гародніну. Карацей кажучы, пакуль што кітайцы робяць першыя крокі, намацваюць грунт пад нагамі. Але калі яны возьмуцца за справу як след, то пацякуць інвестыцыі, будуць тэхналогіі і ўсё астатняе. А агароднікі яны не горшыя, чым галандцы, пра гэта ведаюць усе. Толькі адзін прыклад: яны здатныя варошчваць да некалькіх дзясяткаў відаў грыбоў круглы год, не кажучы пра рознае зяленіва. Але патрэбны сур'ёзныя фінансавыя і матэрыяльныя ўкладанні. На перамовах у Кітаі кіраўніцтва правінцыі Ляонінь запэўніла пружанскае начальства, што пытанне гэтае бярэ пад жорсткі кантроль і што з наступнага года праект запрацуе на ўсю моц.

Як яно будзе на самай справе, пакажа час. А пакуль, не паверыўшы раённым чынам, што сезонныя рабочыя з'ехалі ў сваю Паднябесную, кірую (наступным днём) у Шчарчова — на былую ваенную базу, ці як яе там называюць... Хацелася ўпэўніцца, што кітайцы насамрэч вырошчваюць на Берасцейшчыне кавуны, гэткія ж смачныя, як і ў Азіі...

Шчарчова — не то вёска, не то мястэчка, ад Пружан блізу 30 вёрст. Наўкол лясы, палі, хмызы. Бязлюддзе... Паблізу крамы прытармоўваю, згледзеўшы дзядзьку на ровары і жанчыну. Тыя з ахвотаю загаманілі, назвалі сябе: Леанід Мікалаевіч Пыжко і ягоная жонка Марыя Пыжко. "З'ехалі, ды не ўсе, — удакладняе мужчына, — палова кітайцаў яшчэ тут, мусіць, перабіраюць сваю пекінскую капусту. Сёння хоць і субота, але ў іх хіба бываюць выхадныя?.."

Па праўдзе кажучы, такая навіна больш чым узрадавала. Але Леанід Мікалаевіч тут жа асадзіў: "Яны добрыя, спакойныя людзі. Прыветлівыя такія, але адна бяда: па-нашаму ні бэ, ні мэ, ні кукарэку... І перакладчык іхні, кажуць, паехаў у Пекін. Так што наўрад ці пагаворыш, хіба што на пальцах".

Падзякаваўшы дзядзьку Лёню і за тое, кірую далей — да абшарпаных хрушчовак, дзе быццам тыя кітайцы жывуць. Нейкая жанчына назвала пад'езды і нават кватэры... Заходжу ў страшэнны па выгляду пад'езд, навобмацак шукаю кнопку званка. Але ні той кнопкі, ні той клямкі... Урэшце грукаю ў дзверы насупраць, мо суседзі нешта падкажуць. Дворнічыха Валянціна Грыневіч — маладая, жвавая кабета — распавяла, што кітайцы, па ўсім, у гароднінасховішчы, а бальшыня з'ехала на радзіму. "Яны зусім бяскрыўдныя, да таго ж не п'юць, як нашыя, не лаюцца. Адно працуюць ад цямна да цямна ды спяць у сваіх пакойчыках. Больш і казаць няма чаго: добрыя людзі, не канфліктныя, іх не відаць і не чуваць..."

Тым часам да нас падышло мясцовае начальства — Мікалай Сцяпанавіч Якімчук, дырэктар ААТ "Шчарчова". "Вось ён болей пра іх ведае, — трохі ўзрушылася дворнічыха, — яму і карты ў рукі..."

Мікалай Сцяпанавіч спачатку з недаверам, а пасля як на духу прызнаў: "Працуюць — на зайздрасць — добра: лайдакоў і вылівох не трымаюць. Жывуць, як бачыце, сціпла, амаль па-спартанску... Але ў агародніцтве, як мне бачыцца, пакуль нічым не здзівілі: вырошчваюць моркву, капусту, кабачкі, памідоры... Тэхналогія нічым не адрозніваецца, хіба што адным — адсутнасцю хоць якой тэхнікі. Мы ім і трактарамі дапамагалі, і мінеральнымі ўгнаеннямі, і глебу па восені рыхтавалі. Усё астатняе кітайцы выконваюць уручную, з дапамогай матычкі... Таму і працуюць ад рання да змяркання. Не ведаю, як далей, але без сур'ёзнай агратэхнікі, аграхіміі і сучаснай цяплічнай гаспадаркі наўрад ці дамогуцца прыстойных ураджаяў, прыбыткаў. Хаця, наколькі мне вядома, прадукцыю сваю неяк рэалізуюць. Кітайская гародніна, можа, і таннейшая за нашу, аднак тутэйшыя людзі чамусьці аддаюць перавагу сваёй".

Перасекшы колішні кантрольна-прапускны пост, трапляю ўрэшце ва ўладанні беларускіх кітайцаў. У гароднінасховішчы, былым ваенным ангары, чацвёра мужчын і дзве жанчыны, схіліўшыся над згрувашчанай пад нагамі капустай, аддзяляюць верхняе лісце качанчыкаў, пакуюць іх у тарныя сеткі.

Вітаюся, спрабую неяк завесці гамонку, але нічога не выходзіць, бо моўны бар'ер. І так, і гэтак — вынік адзін: не атрымліваецца ні па-руску, ні па-англійску. Нешта па-свойму шчабечуць, усміхаюцца, але па выразе твараў, па агеньчыках у вачах адчуваецца — людзі не абдзелены ні дабрынёй, ні спагадаю. Бяру ў рукі качанчык, пытаю ў старэйшага — па выглядзе — мужчыны: як па-кітайску капуста?..

"Пай Чай, — адказвае той і спрабуе далей тлумачыць, паказваючы тонкай далонню на сябе і на капусную гару: — Чайна, Пекін..."

"Ван кажа, што гэта і ёсць пекінская капуста", — чую за спінаю голас нашага чалавека.

Уладзімір Дамашук, а гэта ён падышоў да нас, тры месяцы працуе разам з кітайцамі. Сам мясцовы, некалі служыў у воінскай часці. Цяпер, кажа, падрабляю з імі, бо лішняя капейчына кішэню не ломіць...

І як працуецца?

"Нармалёва, — адказвае Уладзімір Мікалаевіч, — людзі яны дысцыплінаваныя, працавітыя. Можаце сабе ўявіць, узялі пад сваю апеку 160 гектараў зямлі і амаль усю плошчу апрацавалі. У асноўным рыдлёўкамі ды матычкамі... Ладзім, нягледзячы на тое, што моўны бар'ер. Цяпер вось іхні перакладчык паехаў у Пекін, але ж неяк разумеемся. Я ўжо засвоіў некалькі кітайскіх слоў..."

Далей затрымліваецца ў Шчарчова не было сэнсу: восеньскі дзень кароткі, абедзенны перапынак у кітайцаў таксама, а іхні перакладчык за трыдзевяць зямель. Мы спрабавалі з ім стэлефанавацца, каб атрымаць дазвол на фотаздымку, але сігнал чамусьці губляўся... Вядомая справа: дзе той Пекін і дзе тое Шчарчова...

Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

ПРОЕКТ

Скульптуры поставили — архитектора проекта сняли

Цирк готовится к торжественному открытию после реконструкции и реставрации. Ремонт был сложный и дорогой — почти 130 млрд бел. руб. в ценах 2006 года. Но здание не ремонтировалось 50 лет, откладывать его обновление на будущее не имело смысла. Теперь в здании появились сменные арены, которые позволят устраивать здесь водные и ледовые шоу. Под манежем — просторная гардеробная с полом из дорогого гранита. Но это все зрители увидят и оценят немного позже, когда станут ходить на представления. А сегодня воочию мы наблюдаем другое: две прекрасные скульптуры, которые установили у входа в Белгосцирк. Наездница на 6-метровой колоне и клоун на трубе. Впечатляет: дорогая бронза, отличное литье. Когда узнаешь, что это только половина задуманного и что рядом вот-вот будут установлены еще две скульптурные композиции, разводишь руками: наша мэрия щедра по-королевски... Я без подтекста: так богато, как сейчас выглядит центр Минска, он может соперничать... Хотела написать с Москвой, но ее центр в последние два десятилетия украшал Церетели. Опасное сравнение. Минск будет соперничать с Минском!

Все работы создал один скульптор — **Сергей Бондаренко**. Мастер в Беларуси известный, талантливый. Архитектор — **Михаил Рыбников**. Он же архитектор всего проекта реконструкции Белгосцирка. Был. Потому что несколько дней назад снят с этой должности. Видно, не все шло так гладко, как хотело бы начальство, не обошлись работы по реконструкции без сучка и задоринки. А без них разве бывает? Когда ремонтировали Белгосфилармонию, ее директор после очередной инспекции проверяющих органов попал с сердечным приступом в больницу. И, к сожалению, оттуда живым уже не вышел... Другие большие минские стройки и реконструкции — Национальная библиотека, сквер на улице Ленина (около Макдональдса) — тоже были "украшены" скандалами, слухами, подозрениями в злоупотреблениях, перепроверками всех и вся...

Но вернемся к хорошему — к искусству, к скульптурам Сергея Бондаренко. Они очень выразительны, богаты деталями. Они фантазийны и выражают самую суть цирка — удивлять. И, что немаловажно, гармоничны со стилем здания, с его декором и лепниной в духе 1950-х годов. Представляю, сколько горожан захочет у скульптур сфотографироваться. Да, это наивная, но очень полезная для психологической разгрузки нашего "верхнего этажа" привычка...

Елена МОЛОЧКО.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Анджэю Пачобуту адмовілі ў акрэдытацыі

Міністэрства замежных спраў Беларусі на перыяд прэзідэнцкай выбарчай кампаніі не акрэдытавала ў якасці журналіста польскай "Газеты выборчай" Анджэя Пачобута.

Адмова тлумачыцца тым, што да гэтага ён працаваў без акрэдытацыі на замежныя сродкі масавай інфармацыі ("Газету выборчу"), што ў сваю чаргу супярэчыць беларускаму заканадаўству. Аднак сам Анджэй Пачобут бачыць у адмове зусім іншы падтэкст:

— Жаданне правесці не дэмакратычныя выбары, а стварыць прыгожую карцінку — галоўная мэта беларускіх улад на гэтую выбарчую кампанію. Зразумела, што людзей, якія працуюць журналістамі ў Беларусі дастаткова доўга, цяжэй падмануць, чым чалавека, які прыехаў на некалькі дзён.

Акрамя Анджэя Пачобута, акрэдытацыю не атрымаў і фотакарэспандэнт "Газеты выборчай", які да гэтага часу ў Беларусі не працаваў. Нягледзячы на забарону, Анджэй Пачобут мае намер працаваць падчас прэзідэнцкіх выбараў у якасці журналіста ўплывовай польскай газеты без акрэдытацыі, паведамляюць польскія СМІ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
23—25 ЛІСТАПАДА 2010 г.

БОЛЬ БЕЛАРУСИ

Референдум 1996 года: *путь в никуда*

Этот материал у меня был готов давно, но ждал своего времени. Пока один из постоянных читателей "Народной Воли" Михаил Дубенчуков в своем письме в редакцию не поднял тему о легитимности нынешней белорусской власти. Я согласен с ним: Лукашенко не имеет права баллотироваться в четвертый раз на пост президента страны, поскольку в 2004 году он, будучи гарантом Конституции, грубо ее нарушил, вынес на референдум вопрос о снятии ограничений на свое пребывание в должности президента. Действительно, читатель прав: нарушение Конституции и Избирательного кодекса — это преступление. Но я бы посмотрел на эту проблему шире и глубже и затронул референдум еще 1996 года, который полностью уничтожил разделение ветвей власти в Беларуси. Главный итог того референдума — у народа отобрали право выбирать и сменять власть.

Сегодня наступил как раз тот момент, когда власти надо напомнить о ее нелегитимности. Рано или поздно белорусский народ пересмотрит итоги того ноябрьского референдума и поймет, что он стал именно той точкой отсчета, которая в Беларуси покончила с честными и легитимными выборами.

Вопреки вердикту Конституционного Суда

После первого референдума 1995 года отношения между Верховным Советом и президентом не нормализовались. Противостояние зашло настолько далеко, что в спор вмешалась судебная власть. Конституционный Суд Республики Беларусь принял позицию депутатов Верховного Совета в части того, что А.Лукашенко злоупотребляет своими полномочиями, издавая указы, не соответствующие Конституции и другим законам. Он признал 18 указов президента не соответствующими Конституции и предложил привести их в соответствие с Основным законом страны.

Но А.Лукашенко уже не реагировал на решения Конституционного Суда. Конечно, он понимал, что главным препятствием на пути к его безграничной власти является Конституция и Верховный Совет 13-го созыва, не позволявшие главе государства диктовать свою волю судебной и законодательной властям. В августе 1996 года президент начинает говорить о необходимости внесения изменений в действующую Конституцию с целью усиления президентской власти. Вот с этого момента и начинается решительное противостояние Верховного Совета 13-го созыва любым изменениям в Конституции. Было очевидно, что А.Лукашенко решил закрепить свою единоличную власть именно через ломку Конституции, стремясь в дальнейшем поставить в зависимость от себя и законодательную, и судебную власти, и органы местного самоуправления. Фактически страна становилась заложницей воли одного человека. С этого момента среди депутатов начинается активная проработка вопроса об импичменте президенту Лукашенко за грубые нарушения Конституции.

Депутаты спешили собрать нужное количество голосов для отстранения президента от должности, а президент всячески старался быстрее провести референдум, после которого его никто бы уже не смог сместить с занимаемого поста. Поэтому две ветви власти пошли на конфликт, получивший широкий резонанс не только в Беларуси, но и за ее пределами. Все попытки депутатов остановить навязываемый референдум не приносили результатов. Более того, предложенный Верховным Советом вариант вопросов для вынесения на всенародное голосование игнорировался исполнительной властью. Все государственные СМИ вели речь только **о поправках, представленных президентом.**

Правовым основанием для проведения референдума послужило постановление Верховного Совета Республики Беларусь от 06.09.1996 г. "О проведении республиканского референдума в Республике Беларусь и мерах по его обеспечению". Выносились на обсуждение две группы вопросов: инициированные президентом и инициированные группой депутатов Верховного Совета.

Президент предложил следующие вопросы:

1. Перенести День независимости Республики Беларусь (День Республики) на 3 июля — День освобождения Беларуси от гитлеровских захватчиков в Великой Отечественной войне.

2. Принять Конституцию Республики Беларусь 1994 года с изменениями и дополнениями (новая редакция Конституции Республики Беларусь), предложенными президентом Республики Беларусь А.Г.Лукашенко.

3. Выступаете ли Вы за свободную, без ограничений, куплю и продажу земли?

4. Поддерживаете ли Вы отмену смертной казни в Республике Беларусь?

Вопросы, предложенные группой депутатов Верховного Совета:

Як склаўся далей лёс бяздомнай Аксені, не вядома, бо на сёння ў вёсцы Кутнеў са старажыхароў амаль нікога няма. Адзінае, што засталося ад былой сядзібы Дубоўскіх, — таўшчэзная, у чатыры абхваты, ліпа ўзбоч вуліцы — як жывы помнік ахвярам таталітарызму.

...Яшчэ адна незабыўная з маленства карціна: напрадвесні, калі ўжо з гары насупраць нашай сядзібы збягалі раўчукі, а снег быў мокры і рыхлы, у хату з ранку зайшла высокая маладая жанчына ў світачцы на плячах, у доўгай палатнянай кашулі, босая, з чырвонымі ад холаду нагамі і рукамі. Я з печы пазіраў, як яна нешта сказала і, нагнуўшыся над карытам, дзе ляжала звараная для свінні бульба, стала даставаць яшчэ гарачыя бульбіны і есці іх неабіранымі... Маці паспела дастаць ёй з печы пару дранікаў, жанчына на хаду з'ела іх і выйшла з хаты.

Пазней я даведаўся ад вяскоўцаў, што гэта была страціўшая розум Волька Наруцкая, бацьку і маці якой з двума дарослымі сынамі раскулачылі і выслалі, а хворую дзяўчыну пакінулі — жыві як хочаш. Пакуль хату і хлявы Юліся Наруцкага камбедчыкі з суседняга мястэчка Пагост не чапалі, Волька начавала там, а днём хадзіла па хатах у пошуках ежы. Потым адны казалі, што яе адправілі ў псіхбальніцу, другія, што забралі энкавэдысты...

Міхась ТЫЧЫНА,
жыхар г.Слуцка.

Быў у нас настаўнік

Ужо год, як няма сярод нас паэта, настаўніка, Чалавека з вялікай літары Мікалая Пятровіча Вяршыніна. Мы, яго вучні, з вялікім жалем думаем пра гэтую страту і згадваем усё, што звязвала нас: першыя крокі ў свет літаратуры з яго падтрымкай і слушнай парадай, з яго няўрымслівым гумарам і ветлай усмешкай.

Помняцца пасяджэнні літаратурнага аб'яднання пры тадышняй газеце "Трактор", які ўзначальваў Мікалай Пятровіч. Мы слухалі яго, выказвалі ўласныя думкі і набіраліся мудрасці. Ён, сатырык і гумарыст, трапна карыстаўся мастацкім словам, прыцягваў трапным жартам, трымаў пяро на вастрыні свайго часу. З ім заўсёды было цікава.

А шлях да творчасці ў паэта быў няпросты. У свой час скончыў аўтамеханічны тэхнікум, затым Белдзяржуніверсітэт. Працаваў інжынерам на падшыпнікавым і старэйшым інжынерам на трактарным заводах, быў вядучым інжынерам навукова-вытворчага прадпрыемства "Прагрэс". Так што добра ведаў жыццё і цану заробленай капейкі.

Аўтар цэлага шэрагу зборнікаў сатыры і гумару вылучаўся сярод многіх менавіта гэтым багатым жыццёвым досведам. Свае творы — то смяшлівыя, то з'едлівыя, то лірычныя — ён не высмоктваў з пальца. Успамінаў аб гадах ваеннага ліхалецця, калі загінулі яго бацькі, а сам стаў дзетдомаўцам і вучыўся быць самастойным. Тыя ўражанні наклалі адбітак на яго вершы:

І сніўся нам кавалак хлеба,
І цёплы матчын бляск вачэй,
І ласкі бацькавай патрэба
Нас не пакінула яшчэ.

Цяжкасці загартавалі яго характар, мабілізавалі сілы, каб ісці далей. Настаўнік вучыў сваім прыкладам не быць абыякавым да ўсяго, што дзеецца вакол, быў у вечным пошуку сэнсу жыцця. Вучыў не стаяць на месцы, а рухацца наперад, бо толькі ў працы пазнаецца і раскрываецца чалавек. Урокі дабрыні і спагады ад Мікалая Пятровіча не забудуцца ніколі, як і ўрокі любові і вернасці. Разам з жонкай Нінай Тарасаўнай яны пражылі змястоўнае, прыгожае жыццё. Яна была для Мікалая Пятровіча і надзейным сябрам, і першым крытыкам, і музай, натхняла яго на новыя кніжкі, якія выходзілі апошнім часам у свет кожны год.

Нам застаецца іх чытаць і адчуваць: любімы настаўнік з намі кожным сваім словам, сваім змаганнем за лепшы — чысты і справядлівы — свет. Хай пачуе ён наша сардэчнае, шчырае "дзякуй".

Ала БАНДАРЭВІЧ,
жыхарка г.Стоўбцы.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
23—25 ЛІСТАПАДА 2010 г.

КОРАТКА

У адстаўку з-за жарту

Міністр юстыцыі Японіі вымушаны пайсці ў адстаўку з-за няўдалага жарту аб лёгкасці сваёй работы. Спадар Мінору Янагіда сказаў, што для выступу ў парламенце яму дастаткова помніць дзве фразы: "Я не магу каменціраваць асобныя выпадкі" і "Я дзейнічаю ў адпаведнасці з законам і доказамі". Разгневаныя дэпутаты палічылі, што за такія выказванні трэба здымаць з пасады, бо яны ганьбяць парламент.

Прэм'ер-міністр Японіі Наото Кан вынес Янагіда строгую вымову за выказванні, з якімі міністр выступіў перад сваімі выбаршчыкамі. І ў панядзелак Янагіда аб'явіў аб сваёй адстаўцы на прэс-канферэнцыі ў Токіа.

Дыпламатычны прарыў

Расія і НАТО будуць сумесна распрацоўваць сістэму супрацьракетнай абароны ў Еўропе. Гэта рашэнне ўжо ахрысцілі "дыпламатычным прарывам" і галоўным вынікам пасяджэння савета Расія—НАТО. І падкрэсліваюць, што прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў выступіў з сенсацыйнай прапановай альянсу стварыць такую сістэму супрацьракетнай абароны, пры якой Расія гатова прыкрыць Еўропу ад магчымых пагроз у абмен на аналагічныя абавязкі Захаду. Эксперты гавораць пра пералом у адносінах паміж Расіяй і НАТО.

У Кітаі з затопленай шахты выратаваны 29 гарнякоў

Яны ў нядзелю аказаліся заблакіраванымі пад зямлёй. Аварыя адбылася ў правінцыі Сычуань. 13 шахцерам удалося самім выбрацца наверх, астатнія засталіся ў шахце. Выратавальная аперацыя працягвалася суткі. Гарнякі шпіталізаваны.

Кітайскія шахты лічацца самымі небяспечнымі ў свеце. Летась у іх загінула больш за 2600 гарнякоў.

Дзякуй, донар!

Учора ў Расіі пачалася акцыя з такой назвай. Яна працягнецца да 27 лістапада. Будзе разгорнута буйнамаштабная інфармацыйная кампанія, мэта якой — зрабіць усё, каб як мага больш людзей даведаліся пра добрую місію донараў.

У Германіі адкрыты музей Нюрнбергскага працэсу

Ён адкрыты ў будынку, у якім 65 гадоў таму адбыўся суд над нацысцкімі злачынцамі. У цырымоніі адкрыцця бралі ўдзел міністры замежных спраў Расіі і Германіі, прадстаўнікі ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі.

Тэрміновая фінансавая дапамога

Прадстаўнікі кіраўніцтва Еўрапейскага Саюза і Міжнароднага валютнага фонду распачынаюць узгадненне дэталяў пагаднення з Ірландыяй аб прадастаўленні ёй тэрміновай фінансавай дапамогі. Мяркуецца, што яна стане гарантыяй фінансавай стабільнасці не толькі гэтай краіны, але і ўсяго Еўрапейскага Саюза і асабліва еўразоны. Ірландыі будзе прадастаўлены пакет дапамогі ў суме 90 мільярдаў еўра.

Суд над самалійскімі піратамі

Ён праходзіць у Гамбургу, суддзяць піратаў, якія захапілі нямецкі карабель. Гэта першы суд над піратамі ў Гамбургу за апошнія 400 гадоў. Калі піратаў прызнаюць вінаватымі, ім пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Каля 250 прыхільнікаў руху «Браты-мусульмане» арыштаваны ў Егіпце

Яны прымалі ўдзел у антыўрадавых дэманстрацыях. Некаторыя з іх арыштаваны за сутыкненні з паліцыяй. Пратэсты выкліканы адмовай выбарчай камісіі зарэгістраваць іх арганізацыю як палітычную партыю на выбарах. Лідары руху абвінавачваюць улады ў тым, што яны падаўляюць апазіцыю.

Парламенцкія выбары ў Егіпце пройдуць 28 лістапада.

Лебедзяў Гамбурга перавозяць у спецыяльныя зімовыя прыстасаванні, дзе іх будуць карміць да вясны. Птушкі, відаць, пра гэта ведаюць, бо паводзяць сябе смірна.

Папа Рымскі Бенедзікт XVI прымае падарунак ад групы інструктараў па гарналыжным спорце падчас аўдыенцыі ў Ватыкане.

Гэтая машына, вынаходка брытанскага канструктара Перы Уоткінса, трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса як самы маленькі сродак язды па звычайных дарогах. Параметры цуда-машыны такія: 104,14 сантыметра ў вышыню, 129,54 — у даўжыню, 66,04 — у шырыню. У ёй нават прадугледжаны папругі бяспекі. Галоўная яе каштоўнасць — ніякіх праблем з паркоўкай.

Як уладкавацца на працу ў Польшчы?

Польскае Міністэрства працы прадоўжыла дзейнасць распараджэння пра спрошчаныя прынцыпы працаўладкавання ў Польшчы іншаземцаў з-за ўсходняй мяжы. Працадаўцам, якія хочуць прыняць на працу беларусаў, украінцаў, расіян, малдаван, дастаткова скласці ў павятовым упраўленні працы заяву аб жаданні працаўладкаваць іншаземца.

Іншаземцы ў асноўным працуюць там, дзе не хочуць палякі. А яны не хочуць там і таму, што існуюць рознага роду сацыяльныя дапамогі, якія яны могуць атрымліваць не працуючы, а памер дапамог прыкладна на такім жа ўзроўні, як мінімальная зарплата. Таму палякі і не жадаюць увіхацца на такой працы. Прыезджыя часцей за ўсё працуюць у сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, у якасці хатняй дапамогі ці займаюцца апекай над хворымі.

Пасля спрашчэння прынцыпаў працаўладкавання іншаземцаў з-за ўсходняй мяжы ад 2006 года ў Польшчу на працу прыехала даволі шмат людзей. Найбольш з Украіны — аж 120 тысяч. Беларусаў, якія легальна працуюць у Польшчы, толькі 4,5 тысячы чалавек.

ПРЫКМЕТЫ

Сіндром доўгіх спадніц

Пад такім загалоўкам польская газета „Dziennik — Gazeta Prawna" апісвае розныя магчымасці прадбачыць эканамічны крызіс. Справа ў тым, што адмыслоўцы неяк не здолелі прадбачыць апошні вялікі крызіс, таму шукаюцца альтэрнатыўныя магчымасці.

У 1920-х гг. амерыканскі эканаміст Джордж Тэйлар заўважыў, што чым горшая сітуацыя ў эканоміцы, тым спадніцы жанчын даўжэйшыя. А чым большую частку ног паказваюць жанчыны, тым лепш ідуць справы ў эканоміцы. Чаму так адбываецца? На думку Тэйлара, гэта прыкмета ўпэўненасці ў сабе і незалежнасці жанчын.

Таму доўгія спадніцы падчас паказаў асенне-зімніх калекцый моды занепакоілі эканамістаў. Яны таксама звяртаюць увагу на іншыя аспекты. Калі назіраецца крызіс, людзі маюць больш свабоднага часу (беспрацоўе) і шукаюць магчымасці адарвацца ад рэчаіснасці. Таму продаж білетаў у кіно расце. Крамы прадаюць таксама больш шакаладу і менш дэзадарантаў (людзі радзей выходзяць з дому). Павялічваецца продаж алкаголю, антыдэпрэсантаў і прэзерватываў. У цяжкія часы людзі не жадаюць мець дзяцей альбо секс робіцца для іх адзінай прыемнасцю.

У НИХ

В обмен на отказ от АЭС

Немецкая телеведущая и публицист Шарлотта Роше , которая активно выступает против атомной энергии, предложила президенту ФРГ Кристиану Вульфу переспать с ней, если Вульф откажется подписывать принятый правительством Ангелы Меркель закон о продлении срока эксплуатации 17 немецких АЭС, сообщает Spiegel.

По словам Шарлотты Роше, она уже обсудила это предложение со своим мужем, и он одобрил инициативу супруги. Теперь, как отметила телеведущая, осталось добиться согласия первой леди — 37-летней Беттины Вульф. "У меня тоже есть татуировки", — заявила Роше, намекая на татуировку на предплечье, которую носит жена президента.

Шарлотта Роше получила широкую известность благодаря появившемуся в 2008 году роману "Feuchtgebiete" ("Влажные места"), в котором писательница подробно останавливается на своей интимной жизни и описывает различные сексуальные практики. О реакции президента ФРГ на предложение Роше пока ничего не сообщается.

Решение правительства Германии продлить сроки эксплуатации АЭС вызвало резкую критику со стороны оппозиционных партий СДПГ, "Зеленых" и Левых, которые пригрозили заблокировать его в бундесрате. В соответствии с новым законом, срок действия АЭС, построенных до 1980 года, будет продлен на восемь лет, а станций, построенных после 1980 года, — на 14 лет. Таким образом, последний реактор на территории Германии должен быть заглушен в 2035 году.

В суд не явились

Трое бывших высокопоставленных чиновников экс-президента Бакиева, обвиняемых в причастности к массовому расстрелу митингующих во время госпереворота в апреле, исчезли. Утром в понедельник бывшие руководитель аппарата президента Каныбек Жороев, руководитель секретариата президента Оксана Малеванная и генеральный прокурор Нурлан Турсункулов, находившиеся под домашним арестом, не явились на очередное заседание суда.

Их адвокаты Артем Иванов и Любовь Иванова сообщили суду, что в пятницу их подзащитным были вручены повестки. После чего юристы их не видели. Отправленные по месту жительства обвиняемых судебные исполнители выяснили, что исчезли как бывшие чиновники, так и их семьи.

Государственный обвинитель, выступая на заседании 22 ноября, заявил, что Малеванная, Жороев и Турсункулов вместе с семьями покинули Киргизию. После пропажи подсудимых суд выдал санкцию на их арест.

Впереди «Гражданская платформа»

Правящая партия "Гражданская платформа" выигрывает выборы в органы местного самоуправления в Польше, сообщила государственная избирательная комиссия.

В ближайшие четыре года кандидаты "Гражданской платформы" будут занимать руководящие должности в большинстве воеводств, повятов и гмин. По данным избиркома, кандидаты от правящей партии побеждают в борьбе за посты мэров в большинстве городов, а также выигрывают в сеймиках воеводств (местные законодательные собрания) с результатом более 31% голосов, у оппозиционной партии "Право и справедливость" — 23%. На третьем месте, по предварительным данным, финиширует партия PSL (Крестьянская партия) с результатом более 15% голосов.

НАКАНУНЕ

Молдова: старые грабли

В Молдове завершается подготовка к внеочередным парламентским выборам. Они пройдут 28 ноября. Для участия в них зарегистрировались около 40 политических партий и независимых кандидатов. Однако шанс пройти в парламент сохраняется у тех партий, которые уже пытались три раза избрать президента, но так и не смогли.

В сентябре из-за низкой явки провалился референдум относительно прямых выборов президента — коммунисты призвали своих сторонников его бойкотировать. Эксперты не исключают, что в новом парламенте снова может сложиться патовая ситуация.

Политический аналитик **Анатол Царану** полагает, что результат выборов будет зависеть от того, насколько партии смогут мобилизовать свой электорат для участия в голосовании. "Вообще, эта кампания дает ощущение усталости. Нет задора, участники затянувшегося политические спора, так сказать, отрабатывают обязательную программу. Все-таки четыре предвыборные кампании за очень короткий период времени - это слишком много. У меня такое ощущение, что наши политические партии так и не научились выстраивать избирательные кампании "по науке", все делается по старинке. Нет креатива, предвыборные слоганы какие-то вымученные. Видно, что профессиональные политтехнологи либо не работают с партиями, либо их работы особенно не видно", — говорит аналитик.

Фактически страна стоит перед выбором: двигаться в сторону Европейского Союза и европейских ценностей либо скатываться назад.

Коммунисты говорят о европейской интеграции, но очевидно, что это лишь риторика.

Главный оппонент коммунистов — Либеральная партия — идет к избирателям с предложением продолжить начатые в 2007 году перемены. Вице-президент Либеральной партии Влад Лупан делает акцент на необходимости одновременного проведения экономической и правовой реформы в стране:

— В течение последних 20 лет Республика Молдова несколько раз пыталась идти по пути развития, однако реформы не были доведены до конца. Молдова сегодня считается самым бедным государством в Европе. Экономическая реформа должна быть подкреплена существенными изменениями в правовой сфере, потому что не может человек инвестировать свои деньги и не быть уверенным в том, что эти деньги у него не отберут и он не сможет в суде отстоять свои права.

С призывом "Молдова без бедности" идет на выборы и Либерально-демократическая партия во главе с нынешним премьер-министром страны Владом Филатом.

Ирина СЕВЕРИН.

ТАМ, ГДЕ ДИКТАТУРА

Аллах послал народу всеми любимого президента

"Буду молиться Аллаху, чтобы ты, дорогой президент, стал пожизненным", — с такими словами обратился на днях к президенту Туркмении Гурбангулы Бердымухамедову председатель ЦИК этой страны Мурад Каррыев. Случилось это на торжественном собрании, посвященном 19-й годовщине независимости. Речь свою г-н Каррыев держал после выступления самого президента. Председатель ЦИК выглядел необычайно взволнованным, а его речь была чрезвычайно эмоциональной, что хорошо слышно из репортажа туркменской службы Радио Свобода.

"Всемогущий уважает туркменский народ. Всевышний внимателен к нам. Туркменский народ такой счастливый! И такому счастливому народу Аллах послал всеми любимого президента", — заявил Мурад Каррыев. Стоит ли говорить, сколь бурными и продолжительными оказались аплодисменты после его речи, сообщается на сайте газеты "Время новостей". Далее там подчеркивается, что Каррыеву не привыкать к подобным бенефисам. Он уже солировал на таких мероприятиях, предлагая поддержать "всенародную инициативу" о присвоении Гурбангулы Бердымухамедову высокого звания Героя Туркменистана. Предлагал дважды, и оба раза неудачно. Нынешний президент оказался гораздо скромнее предыдущего — Великого Сапармурата Туркменбаши, этим званием не побрезговавшего.

На этот раз все обстоит серьезнее. И не только потому, что Бердымухамедов с ходу не отверг инициативу Каррыева. Выступление главы ЦИК может показаться экспромтом высокопоставленного вельможи, стремящегося угодить "венценосной" особе. По сути же оно означает возможное начало подготовки к так называемой предвыборной кампании в Туркмении. В феврале 2011 года истекает четырехлетний срок президентских полномочий Бердымухамедова, избранного 11 февраля 2007 года и спустя три дня вступившего в должность президента. Тогда у него было пять соперников, которых он сумел победить с почти 90-процентным результатом, оставив каждому из них в среднем по 2% голосов.

Согласно новой конституции Туркмении, принятой уже после выборов 2007 года, срок президентских полномочий был увеличен с четырех до пяти лет. "Пожизненная" инициатива председателя ЦИК, очевидно, связана с необходимостью запустить пробный шар с целью изучить реакцию мирового сообщества на попытку избежать проведения пусть даже формальных выборов президента. В Ашхабаде понимают, что попытка Бердымухамедова уже сейчас пойти по пути президента Казахстана Нурсултана Назарбаева, закрепившего за собой статус "лидера нации" и тем самым практически избавившего себя от конкурентов на властном олимпе, была бы предпринята слишком рано — всего лишь на четвертом году президентства.

Похоже, эти сомнения не слишком терзают самого Бердымухамедова. В своем обращении к народу по случаю праздника он без тени сомнения заявил, что под его руководством Туркмения вошла в "число самых передовых, самых авторитетных государств мира", она "неукоснительно следует принятым на себя международным обязательствам", "благодаря чему снискала славу в мировом сообществе как страна с блестящим будущим". В связи с этим любопытно взглянуть, как выглядит эта страна из числа "передовых авторитетных государств" в списках, опубликованных различными международными организациями.

Туркменский путь к "блестящему будущему", судя по всему, будет ухабистым.

В рейтинге экономических свобод, составленном американским фондом "Херитидж фаундейшн", Туркмения занимает 171-е место среди 183 государств.

В индексе уровня подверженности коррупции, составленном организацией "Транспеpенси Интернэшнл", в котором значится 178 стран, Туркмения делит с Узбекистаном 172-е место (еще хуже обстоят дела только в Сомали, Мьянме, Ираке и Афганистане).

Последнее место принадлежит Туркмении в рейтинге прозрачности управления природными ресурсами, составленном неправительственными организациями "Ревеню Уотч институт" (США) и "Транспеpенси Интернэшнл".

В рейтинге свободы прессы международной организации "Репортеры без границ" за 2010 год Туркмения заняла 176-е место из 178 возможных (замыкают список Северная Корея и Эритрея).

По оценке международной правозащитной организации "Хьюман райтс уотч", власть в Туркмении — "одна из самых репрессивных в мире". Согласно докладу другой правозащитной организации — "Фридом хаус", Туркменистан входит в группу "устойчивых авторитарных режимов".

Президент Бердымухамедов, по оценке американского журнала "Форин полиси", занимает пятое месте среди "худших диктаторов мира", опережая президента Ирана Махмуда Ахмадинежада и ливийского лидера Муаммара Каддафи.

Аркадий ДУБНОВ.

ЧТО НОВОГО?

В 2020 году Китай обойдет США по объему экономики

К 2030-му он будет вырабатывать 24 процента мирового ВВП. Об этом сообщается в прогнозе экономистов банка Standard Chartered, передает Bloomberg. Кроме того, по расчету специалистов, Индия обойдет Японию и займет третье место в списке крупнейших экономик мира.

Сейчас ВВП КНР составляет около 9 процентов от мирового. По объему экономики страна делит второе место с Японией.

Современные супермены

"Впервые в истории человечества простой индивид, не обладающий традиционными атрибутами власти и харизмой, может спровоцировать всемирный беспорядок или дестабилизировать институты и целые страны, — пишет Le Monde. — Это означает способность человека или группы людей с помощью новейших технологий удовлетворить жажду власти или побороться с теми, кого еще десять лет назад они бы не осмелились даже пальцем тронуть".

Социальные сети и блоги в интернете, где свободно циркулирует информация, позволяют незнакомым людям устанавливать связи для достижения конкретных целей. Чтобы устроить политическое цунами, подчас достаточно просто подать голос в нужный момент. Новые электронные технологии можно использовать как в мирных, так и в военных целях.

"Еще двадцать лет назад единственной угрозой национальной безопасности считался Советский Союз. Теперь враг может жить в соседнем доме или этажом выше", — пишет в заключение издание.

Храм богини английского языка

Лидеры касты далитов, или так называемых "неприкасаемых", занимающих самое низкое место в кастовой иерархии Индии, задумали возвести храм богини английского языка, пишет The Telegraph.

По планам инициаторов, на стенах храма будут высечены цитаты из англоязычных авторов, а также вывешена икона лорда Томаса Маколея — чиновника Британской Индии, который настоял на введении повсеместного изучения английского языка для индусов. Именно в его часть формально и будет открыт храм богини английского языка. Далиты, по их словам, не собираются останавливаться на одном храме, а планируют возвести подобные святыни по всей стране.

Лидеры "неприкасаемых" утверждают, что появление храма даст импульс индийским подросткам из низших каст к изучению английского языка. По мнению далитов, только таким образом представители низших слоев индийского общества могут обеспечить себе пристойное будущее. В частности, уверены они, владение английским языком позволит членам 160-миллионной общины далитов получать хорошее образование, бороться за государственные посты и заключать выгодные брачные союзы.

Отметим, что английский язык и так широко распространен в Индии, бывшей британской колонии. Однако, хотя он и входит в число государственных языков, в большинстве случаев английский является прерогативой высших каст, представители которых работают в крупных компаниях.

Экспедиция на Марс

Американское космическое агентство NASA изучает возможность колонизации людьми других миров, таких как Красная планета, в рамках амбициозного проекта, пишет Daily Mail.

Директор NASA Ames Пит Уорден сообщил, что один из главных исследовательских центров NASA, Ames Research Centre, получил финансирование на сумму 1 млн фунтов, чтобы начать работу над проектом. "Мы также надеемся привлечь некоторых миллиардеров, чтобы сформировать фонд Hundred Year Starship", — сказал Уорден. Он также сказал, что миссия должна сначала посетить спутники Марса, откуда ученые смогут провести интенсивное исследование планеты с помощью телероботов. По его словам, люди могут прибыть на спутники Марса к 2030 году.

Народная Воля http://www.nv-online.info
23—25 ЛІСТАПАДА 2010 г.

ПАМЯЦЬ

Раскажыце пра змагароў

Паважаная рэдакцыя!

Я не згодны з тым, што апошнім часам адносна беларускага народа ўжываецца нярэдка азначэнне “талерантны” ў скажоным сэнсе. Паводле тлумачальных слоўнікаў, *“талерантны”* азначае *“цярпімы”* (да іншай думкі, веры, нацыянальнасці), а зусім не *“цярплівы, рахманы, пакорлівы, бязмоўны, згодны з гвалтам, хлуснёй, подласцю”*. Такая падмена сэнсу слова, лічу, вядзе да падмены нашай сапраўднай гісторыі, да забыцця таго, што беларусы (са сваёй талерантнасцю) цягам толькі апошніх двух стагоддзяў узнімалі некалькі буйных нацыянальна-вызвольных паўстанняў, пакінуўшых глыбокі след у лёсе Айчыны. Імёны Тадэвуша Касцюшкі, паўстанцаў 1830 года, герояў-каліноўцаў, як і стваральнікаў задушанай бальшавікамі Беларускай Народнай Рэспублікі (а без яе не было б незалежнай Рэспублікі Беларусь), павінны быць перад кожным з нас высокім прыкладам адданасці Радзіме, нязломнай мужнасці і нязгаснага духоўнага святла.

Гэта ж тычыцца ў поўнай меры і змагароў Слуцкага збройнага чыну 1920 года, пра які мы ведаем вельмі і вельмі мала. Раскажыце, калі ласка, аб гэтай старонцы ў гісторыі Бацькаўшчыны.

З павагай —

Уладзімір ВЕЛЯСНІЦКІ.

Гродзенская вобласць.

Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ,
доктар гістарычных навук, прафесар

Нескароныя

Да 90-годдзя Слуцкага збройнага чыну

У канцы лістапада — снежні 2010 года спаўняецца 90 год з апошняга ўзброенага супраціву беларусаў супраць падзелу нашай тэрыторыі паміж савецкай Расіяй і Польшчай, за незалежную Беларусь.

Савецкія гісторыкі не прызнавалі гэтае паўстанне. Нават у “Нарысах гісторыі Беларусі” (ч.2, 1995 г.) гаворыцца, што “ніякага паўстання ў Слуцку не было”.

У беларускай замежнай літаратуры пра Слуцкі збройны чын 1920 года згадваецца таксама мала. Апублікаваны ўспаміны ўдзельнікаў паўстання ў некаторых беларускіх газетах замежжа. Чатыры старонкі пра паўстанне напісаў Язэп Найдзюк у сваёй кнізе “Беларусь учора і сяньня” (1943 г., перавыдадзена ў 1993 годзе).

Я, захоплены гэтай гістарычнай падзеяй, пачаў пісаць пра яе яшчэ ў 1966 годзе, у тым ліку ў “Энцыклапедыі беларускай ССР”. Праўда, тыя артыкулы, часам і ёмістыя, былі заснаваны на дакументах, якія змяшчаліся ў тагачасным савецкім друку...

Пра Слуцкае паўстанне на аснове польскіх архіваў пісаў беларускі даследчык з Беластока Алег Латышонак. У апошні час на гэту тэму з'явіліся раздзелы ў айчынных выданнях “Старонкі нашай мінуўшчыны” (2009) і “Заходні фронт РФССР 1918—1920” (2010 г.). Выдадзены дакументы ў зборніку “Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах” (2001 г., другое выданне — 2006 г.).

Як жа ўсё было на самай справе?

Канец савецка-польскай вайны

Падзеі, пра якую ідзе гаворка, папярэднічаў апошні наступ польскіх войск пры заканчэнні расійска-польскай вайны 1919—1920 гадоў. Гэта было пасля разгрому савецкіх войскаў пад Варшавай і заняцця імі тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, у перыяд адступлення дэмаралізаваных войск Чырвонай Арміі.

Пры наступе польскіх войск імі на два-тры дні быў заняты Мінск, а 11 кастрычніка — Слуцк. Урэшце 12 кастрычніка 1920 года ў Рызе быў падпісаны дагавор аб перамір'і і папярэдніх умовах міру, паводле якога Расія, не пытаючыся ва ўрада Беларускай ССР, адмаўлялася ад Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на карысць Польшчы, а Польшча прызнавала ўяўную незалежнасць БССР і УССР.

Дагавор дазваляў польскім войскам наступаць яшчэ шэсць дзён, ужо за лініяй новай дзяржаўнай мяжы, і ў некаторых месцах прасунуцца наперад ажно на 100 кіламетраў ад мяжы. Адступаць польскія войскі павінны былі пасля ратыфікацыі дагавора і абмену ратыфікацыйнымі граматамі паміж Польшчай і Расіяй. Беларуская ССР у гэтым не ўдзельнічала, а яе прадстаўніка А.Чарвякова член расійскай дэлегацыі А.Іофе не дапусціў да перамоў з Польшчай, спасылаючыся на інструкцыю з Масквы.

Пярэдадзень

Слуцк і Слуцкі павет былі тады асяродкамі беларускага нацыянальнага руху. Частка інтэлігенцыі займала актыўныя патрыятычныя пазіцыі. Асноўным чынам Слуцкага паўстання стала беларускае сялянства, якое выступала за незалежнасць сваёй дзяржавы — Беларускай Народнай Рэспублікі.

Польскія войскі павінны былі адступіць за лінію дзяржаўнай мяжы. Толькі ў лістападзе 1920 года яны перадалі цывільную ўладу ў Слуцку і павеце Беларускаму нацыянальнаму камітэту, у якім пераважалі прадстаўнікі партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). У валасцях Слуцкага павета былі ўтвораны адпаведныя беларускія нацыянальныя камітэты, якія замянілі прызначаных польскімі ўладамі войтаў у валасцях і солтысаў у вёсках. Была створана беларуская міліцыя для ахоўвання парадку ў Слуцку і Слуцкім павеце.

Прадстаўнікі беларускіх эсэраў займалі незалежніцкія пазіцыі, упэўненыя, што на іх роднай зямлі не павінны панаваць ні Польшча, ні Расія. Дарэчы, падчас савецка-польскай вайны беларускія эсэры былі саюзнікамі бальшавікоў і разам змагаліся супраць “белапалякаў” (як тады бальшавікі называлі польскае войска). Эсэры вырашылі склікаць з'езд Случчыны, каб устанавіць легальную ўладу. У валасцях павета і ў Слуцку былі праведзены выбары дэлегатаў на з'езд Случчыны.

Пратэст супраць чужацкай улады

З'езд адбыўся ў Слуцку ў вялікай зале дома Эдварда Вайніловіча, фундатара Чырвонага касцёла ў Мінску. Сабралася 107 прадстаўнікоў горада і валасцей з правам пастанаўляльнага голасу і 10 — з правам дарадчага.

З'езд пачаўся 14 лістапада а 12-й гадзіне дня і працягваўся да 10 гадзін вечара 15 лістапада. Праходзіў ён ва ўрачыстым духу. Кіравалі з'ездам беларускія эсэры. 14 лістапада дэлегаты прынялі рэзалюцыю, у якой віталі найвышэйшую раду Беларускай Народнай Рэспублікі і заявілі катэгарычны пратэст супраць савецкай улады на Беларусі як “чужацкай”. Асноўным зместам рэзалюцыі было рашэнне падняць паўстанне “супраць акупацыі”, за “незалежную Беларусь”.

Першы з'езд Случчыны выбраў Раду Случчыны Беларускай Народнай Рэспублікі ў складзе 17 чалавек на чале з Уладзімірам Пракулевічам, перадаў ёй цывільную ўладу і даручыў арганізацыю нацыянальнага войска. Рада Случчыны лічылася часовым урадавым органам аж да ўтварэння выбарнага органа на ўсёй Беларусі.

Ад 16 лістапада пачалі сваю дзейнасць Беларуская Рада Случчыны з 17 сяброў і яе прэзідыума (5 чалавек). У складзе Рады было 8 беларускіх эсэраў — У.Пракулевіч, В.Русак ды іншыя. Да іх прымыкалі спачувальцы. Другой групоўкай у Радзе выступалі прыхільнікі генерала С.Булак-Балаховіча — А.Паўлюкевіч, прадстаўнікі “нейтральных груп”.

Першачарговай справай Рады стала фарміраванне войска, дзеля чаго была створана вайсковая тройка з сяброў Рады — Павел Жаўрыд, капітан Анастас Анцыповіч і паручнік Янка Мацэлі, якія спешна пачалі збіраць узброеныя аддзелы. Іншыя сябры Рады займаліся арганізацыяй цывільных устаноў. Такім чынам за некалькі дзён утварылася не толькі аснова беларускага нацыянальнага войска, але і органа дзяржаўнай улады, хай сабе толькі ў межах аднаго павета.

21 лістапада Слуцкая Рада выдала дэкларацыю, якая заклікала сялянства на барацьбу за “незалежную Беларусь у яе этнаграфічных граніцах” і за “інтарэсы сялянства”.

Слуцкая брыгада

Пры актыўнай патрыятычнай падтрымцы сялян і гараджан літаральна за тры дні з добраахвотнікаў была сфарміравана 1-я Слуцкая брыгада стральцоў Беларускай Народнай Рэспублікі, якая складалася з двух палкоў: 1-га Слуцкага і 2-га Грозаўскага. Першы полк фарміраваўся ў Слуцку, другі — у мястэчку Грозава (цяпер у Капыльскім раёне). Юнакоў і маладых людзей, якія скончылі Слуцкую гімназію ці мелі іншую адукацыю, набіралі ў беларускую вайсковую школу ў Лідзе, каб мець потым свае афіцэрскія кадры. У пачатку снежня 1920 года туды накіравалі каля 80 чалавек.

Абодва палкі ў канцы лістапада 1920 года налічвалі 4 тысячы жаўнераў, у асноўным з беларускай міліцыі і сялян-добраахвотнікаў. Аднак зброі было мала — хіба што вінтоўкі, прынесеныя з сабой беларускімі жаўнерамі. Разам з рэзервамі ў брыгадзе налічвалася каля 10 тысяч чалавек.

А ў гэты час польскія войскі мусілі адысці за лінію новай мяжы, вызначаную папярэднім мірным дагаворам. 14 лістапада было падпісана спецыяльнае пагадненне паміж польскім і расійскім бакамі аб вывадзе польскіх войск, а сам вывад пачаўся 22 лістапада.

24 лістапада польскія войскі пакінулі Слуцк. 29 лістапада часці Чырвонай Арміі выйшлі на новую дэмаркацыйную лінію: мястэчка Вызна — мястэчка Леніна, заняўшы горад Слуцк. Паміж дзяржаўнай мяжой і дэмаркацыйнай лініяй савецкіх войск да падпісання канчатковага міру з Польшчай ўтваралася 15-кіламетровая нейтральная зона. З польскага боку таксама ўтваралася 15-кіламетровая нейтральная зона. У гэты 30-кіламетровы пас не мелі права заходзіць ні расійскія, ні польскія войскі.

Слуцкі збройны чын

У канцы лістапада 1920 года пачаўся Слуцкі збройны чын — гераічны чын нашага народа ў барацьбе за незалежнасць Беларусі. **ПЕРШЫ ДЗЕНЬ БАЕЎ — 27 ЛІСТАПАДА — УВАЙШОЎ У ГІСТОРЫЮ, ЯК ДЗЕНЬ ГЕРОЯЎ.** Яму прысвечаны вершы, песні і марш...

Баявыя дзеянні слуцкіх жаўнераў, распачатыя 27 лістапада, скончыліся 28 снежня 1920 года. Ужо ў канцы лістапада 1-ы Слуцкі полк займаў участак фронту ад мястэчка Семежава да мястэчка Вызна працягласцю прыкладна 20 кіламетраў. Ад 27 лістапада падраздзяленні 1-га Слуцкага палка рабілі рэгулярныя налёты на месцы размяшчэння часцей 8-й дывізіі 16-й арміі Заходняга фронту РСФСР, яе палявыя варты і заставы на дэмаркацыйнай лініі. У наступныя дні паўтараліся безупынныя нападкі і на ўчастку размяшчэння 2-га Грозаўскага палка — на палявыя варты савецкіх часцей, асабліва моцныя на ўчастку Капыль—Цімкавічы—Вызна — ужо працягласцю 60 кіламетраў.

Спачатку камандаванне Чырвонай Арміі не ведала, што яно сутыкнулася з узброенымі сіламі Слуцкай брыгады. У аператыўнай зводцы палявога штаба Чырвонай Арміі гаварылася пра ваенныя сутычкі з атрадамі С.Булак-Балаховіча, хаця акцыя Балаховіча на Палессі ўжо скончылася. Аднак разведка Чырвонай Арміі дзейнічала недасканала.

Камандаванне 16-й арміі савецкіх войск вырашыла ачысціць нейтральную зону ад слуцкіх жаўнераў, хаця па ўмовах перамір'я ў нейтральную зону, нават на сваёй тэрыторыі, войскі абодвух бакоў заходзіць не мелі права. Аднак польскія вайсковыя ўлады далі дазвол на ўваход савецкіх войск у нейтральную зону на тры дні, пачынаючы з 4 снежня. Аднак карная аперацыя Чырвонай Арміі дала мізэрны вынік: было затрымана каля 50 дэзерціраў і 15 перабежчыкаў...

Камандаванне Слуцкай брыгады, карыстаючыся падтрымкай мясцовага насельніцтва, вывела свае асноўныя сілы з-пад удару чырвоных войск. Тады рэвваенсавет Заходняга фронту ўсклаў кіраўніцтва аперацыяй па барацьбе супраць Слуцкай брыгады на рэвваенсавет 16-й арміі з падначаленнем яму ўсіх аддзелаў унутранай службы, губчэка, асобых аддзелаў і загараджальных атрадаў, якія знаходзіліся ў раёне размяшчэння 16-й савецкай арміі (са штабам у Магілёве).

Толькі ў раёне Семежава частка аддзелаў Слуцкай брыгады была разбіта і 7 снежня перайшла польскую мяжу. Пры тым польскія ваенныя ўлады раззброілі 30 афіцэраў і 400 жаўнераў з дзвюх рот Слуцкай брыгады. Сама ж брыгада адышла да самай мяжы (на 8 кіламетраў на захад ад Семежава).

У гэты час у кіраўніцтве брыгады рознагалоссі паміж групоўкамі эсэраў і прыхільнікамі С.Булак-Балаховіча прывялі да змены камандавання брыгадай. Камандзір 1-га Слуцкага палка капітан Павел Чайка быў арыштаваны па абвінавачанні ў здрадзе: ён спрабаваў перадаць пакет з сакрэтнымі дакументамі на савецкі бок. Але пры дапамозе свайго сябра паручніка А.Мірановіча — начальніка контрразведкі — П.Чайка здолеў уцячы з-пад арышту ў Слуцк. Там ён быў арыштаваны ўжо савецкімі органамі за здраду савецкай уладзе і па прысудзе “тройкі” асобага аддзела 16-й арміі расстраляны 9 студзеня 1921 года...

Рада Случчыны сабралася на надзвычайнае пасяджэнне і пастанавіла змяніць камандзіра брыгады і начальніка контрразведкі. Камандзірам 1-й Слуцкай брыгады 3 снежня быў прызначаны штабс-капітан Антон Сокал-Кутылоўскі (раней камандзір 2-га батальёна 1-га Слуцкага палка), а камандзірам 1-га палка — падпалкоўнік Ахрэм Гаўрыловіч, раней камандзір 4-га батальёна гэтага палка. Начальнікам контрразведкі быў прызначаны паручнік Тодар Янушэнка. Камандзіру брыгады Рада Случчыны часова перадала дыктатарскія паўнамоцтвы.

Цяпер штаб Слуцкай брыгады знаходзіўся ў вёсцы Грыцэвічы, у двух кіламетрах ад ракі Лань у нейтральнай зоне, але ўжо на тэрыторыі, якая адышла да Польшчы паводле мірнага дагавора. Пасля вяртання савецкіх часцей з нейтральнай зоны на дэмаркацыйную лінію слуцкія жаўнеры вярнуліся на свае пазіцыі і зноў пачалі нападаць на перадавыя часці Чырвонай Арміі.

Ваенныя дзеянні працягваліся. Звычайна гэта былі начныя налёты. Так, у ноч на 10 снежня быў зроблены напад на вёскі Крывасёлкі і Навасёлкі, у ноч на 12 снежня — на вёску Старынь. Потым аддзелы Слуцкай брыгады зрабілі спробу адцясніць перадавыя часці Чырвонай Арміі з займаемых імі пазіцый.

Быў распачаты наступ на мястэчкі Семежава і Вызна. У ноч на 13 снежня слуцкія жаўнеры зноў занялі Семежава, але потым з боем адышлі. Штаб Слуцкай брыгады перамясціўся ў вёску Морач (у 20 кіламетрах на захад ад Вызны). У наступных баях у ноч на 18 снежня аддзелы Слуцкай брыгады зноў занялі Семежава, а ў наступную ноч — Вызну і прасунуліся на ўсход ад яе.

Сабраўшы значныя сілы, раніцай 19 снежня войскі Чырвонай Арміі пачалі свой наступ. У гэты ж дзень чырвонымі было адбіта мястэчка Вызна. Слуцкія жаўнеры пачалі адыходзіць на захад да вёскі Смолічы (у 10 кіламетрах на захад ад Вызны). 20 снежня яны былі выцеснены да ракі Морач. У той жа дзень чырвоныя выбілі іх і з Семежава.

Штаб Слуцкай брыгады вымушаны быў перабрацца ў вёску Заастравечча (Клецкі раён) каля ракі Лань, за якой стаялі польскія войскі. Сюды збіраліся падраздзяленні Слуцкай брыгады, у якіх было ўжо мала зброі і боепрыпасаў.

Рада Случчыны прыняла рашэнне аб пераходзе Слуцкай брыгады праз раку Лань. Перад самым пераходам 1-ы Слуцкі полк за ўдзел у баях атрымаў ад Рады палкавы сцяг. На ім быў надпіс: **“ПЕРШЫ СЛУЦКІ ПОЛК БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ”...**

28 снежня 1920 года палкі Слуцкай брыгады перайшлі Лань. Жаўнеры і афіцэры, здаўшы зброю польскім уладам, былі інтэрнаваныя ў часовым лагеры ў мястэчку Сіняўка (Клецкі раён), потым пераведзены ў лагер у Беластоку, а пасля — у Дарагуску. Яны былі вызвалены з лагера толькі ў маі 1921 года, пасля падпісання (сакавік 1921 г.) і ратыфікацыі канчатковага расійска-польскага мірнага дагавора.

Але са складу брыгады адзін батальён (каля 400 чалавек) на чале са сваімі афіцэрамі застаўся ў нейтральнай зоне для працягу ваенных дзеянняў партызанскага характару — асобнымі групамі.

...У акрэсе гістарычнага лёсу Беларусі пачатку XX стагоддзя Слуцкі збройны чын адыграў значную ролю. Гэта быў патрыятычны выступ беларускага сялянства і інтэлігенцыі ў барацьбе за незалежнасць Бацькаўшчыны, за самастойную дзяржаву з легальнай дэмакратычнай уладай. Ён быў накіраваны супраць ганебнага падзелу тэрыторыі Беларусі паміж Расіяй і Польшчай.

Слуцкія жаўнеры за сціплы тэрмін здолелі ўтварыць баявыя адзінкі беларускага войска, якія, натхнёныя любоўю да Айчыны, здолелі ў неспрыяльных умовах весці цяжкую і напружаную барацьбу супраць больш мацнейшага праціўніка. Аднак у тых абставінах, якія склаліся ў канцы 1920 года, без усялякай дапамогі звонку, пры варожай па сутнасці пазіцыі Польшчы лёс паўстання быў прадвызначаны... Але гэта не змяншае яго значэння. **СЛУЦКІ ЗБРОЙНЫ ЧЫН 1920 ГОДА ЎВАЙШОЎ У ГІСТОРЫЮ ЯК ГЕРАІЧНЫ ВЫЧЫН БЕЛАРУСКАГА НАРОДА, ЯГО ПАРЫЎ ДА СВАБОДЫ.**

У Горках паставілі помнік паўстанцу-каліноўцу з надпісам па-руску

У Горках аднавілі помнік паўстанцу-каліноўцу Войцэху Дамарацкаму. Ён загінуў 24 красавіка 1863 года ў час вызвалення мястэчка ад войск Расійскай імперыі. Надпіс на новым надмагіллі загінуўшага паўстанца зроблены па-руску. На гэтай жа мове быў надпіс і на старой расколатай пліце.

Магіла студэнта Горы-Горацкага земляробчага інстытута знаходзіцца на тэрыторыі дэндрапарку цяперашняй сельгасакадэміі. Па дапамогу ў аднаўленні надмагілля да кіраўніцтва навучальнай установы звяртаўся горацкі журналіст Эдуард Брокараў.

Рабіць надпіс на рускай мове на магіле каліноўца — гэта блюзнерства. Такое меркаванне журналіст выказаў у інтэрв'ю Радыё Свабода. Прарэктар па вучэбна-выхаваўчай працы акадэміі Аляксандр Салянік прызнаў, што з аднаўленнем паспяшаліся і пра мову не падумалі.

Надмагілле Войцэху Дамарацкаму ўсталявалі напрыканцы васьмідзясятых гадоў. Прастаяла яно нядоўга. Хто яго пашкодзіў, не вядома. Больш за два дзясяткі гадоў мармуровая пліта праляжала расколатай ля ходніка адной з алеяў парку.

Беларусы значна апярэдзілі планы ўрада па колькасці аўтамабіляў на душу насельніцтва

Як паведаміў міністр унутраных спраў Анатоль Куляшоў на сустрэчы з жыхарамі Фрунзенскага раёна Мінска, колькасць аўтамабіляў у Беларусі ўжо дасягнула ўзроўню, які прагназаваўся да 2015 года. Гэты факт сведчыць аб эканамічным росце, сцвярджае міністр.

Дарэчы, Анатоль Куляшоў паведаміў, што ў мінулым годзе ў сталіцы было пабудавана парковак на 20 тысяч месц, і гэта работа будзе працягвацца.

Мінская гарадская электрычка з'явіцца да канца гэтага года

У сталіцы на ўчастку чыгуначнага шляху паміж станцыямі "Мінск-Пасажырскі" і "Ждановічы" вядуцца працы па рэканструкцыі шляхоў і пасажырскай інфраструктуры для пуску новага тыпу транспарту — гарадской электрычкі. Як заявіў галоўны інжынер Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі Генадзь Лебедзеў, рэгулярныя рэйсы плануецца адкрыць у канцы 2011 года. Гэты накірунак абраны ў сувязі з маштабнай жыллёвай забудовай раёнаў "Каменная Горка" і "Дамброўка" на захадзе сталіцы. Мяркуецца, што ў перспектыве гарадская электрычка будзе абслугоўваць і іншыя накірункі.

Цяперашняя колькасць пасажыраў на ўчастку "Мінск-Пасажырскі—Ждановічы" ацэньваецца ў 467 тысяч чалавек за год. Па прагнозах, да 2030 года іх колькасць можа вырасці да 9 мільёнаў чалавек у год, перадае агенцтва "Мінск-навіны".

Дваровы сабака ўратаваў жыцці двух чалавек

Дваровы сабака ўратаваў жыцці двух чалавек пры пажары ў вёсцы Котра Гродзенскага раёна.

Гаспадар адной з кватэр двухпавярховага дома ранкам пайшоў на медкамісію. Калі ж вярнуўся і адчыніў уваходныя дзверы, то літаральна на парозе сваёй кватэры страціў прытомнасць ад дыму.

У дом забег дваровы сабака і стаў тузаць пацярпелага за руку. Так мужчына ачомаўся і нават прыгадаў, што побач жыве інвалід. Ён вывеў суседа з задымленай кватэры.

Не змаглі разбудзіць

Аналагічнага здарэння, напэўна, не прыпомняць не толькі ў Беларусі.

19 лістапада ў 10.10 у Мінску на скрыжаванні вуліц Рафіева і Ясеніна адбылося ДТЗ з удзелам маршрутнага таксі і тралейбуса.

Як паведаміў БелаПАН старшы інспектар па агітацыі аддзела ДАІ Маскоўскага РУУС Дзмітрый Максюта, паводле папярэдніх звестак, вадзіцель маршруткі знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення. Пасля ДТЗ супрацоўнікі міліцыі ўвогуле не змаглі яго разбудзіць і з "алкагольным" дыягназам накіравалі ў бальніцу.

Дзякуй Богу, у маршрутным таксі людзей не было, а ў тралейбусе пасажыры не пацярпелі. Але пытанне відавочнае: што рабіць з такімі нелюдзямі на дарогах?

Народная Воля
http://www.nv-online.info
23—25 ЛІСТАПАДА 2010 г.

ПЕРСОНА

Славамір Адамовіч. Непатрэбны паэт

Больш як дзесяць год таму імя паэта і грамадскага дзеяча Славаміра Адамовіча выбухнула і ўзрушыла Беларусь. Чалавек-скандал, які ў знак пратэсту зашыў сабе рот і адсядзеў год у турме за верш "Убей президента". А праз некаторы час з'ехаў за мяжу. Добраахвотны выгнаннік праз 8 гадоў жыцця ў Нарвегіі вярнуўся на радзіму. Ці надоўга, высвятляла "Народная Воля".

Творчая сустрэча са **Славамірам Адамовічам** была прызначана на вечар звычайнага будзённага дня. На спатканне з паэтам сабралося каля 20 слухачоў, добрая частка з якіх была журналістамі. У сваім электронным блогу Адамовіч пісаў, што сустрэчы з аматарамі ён будзе праводзіць каля помніка Янку Купалу ў самым цэнтры Мінска. Але справы склаліся па- іншаму, і паэтычную сустрэчу прыйшлося перанесці ў Сядзібу Партыі БНФ.

Так і не дачакаўшыся наплыву ахвотных далучыцца да паэтычнага вечара, Славамір Адамовіч пачаў сваё выступленне з хвіліны маўчання — у памяць тых, хто так ці інакш ахвяраваў свой лёс на карысць радзіме. Паэт добра ведае, што значыць пацярпець за ўласныя погляды. Агульную вядомасць Адамовіч атрымаў пасля таго, як падчас адной з апазіцыйных акцый у 1997 годзе публічна зашыў сабе рот. Да гэтага ён год правёў у турме за прызыў да незаконнага звяржэння ўлады, незаконнае перасячэнне мяжы і незаконнае нашэнне халоднай зброі. У 2003 годзе паэт папрасіў гуманітарны прытулак у Нарвегіі, дзе і жыў да апошняга часу. Перыядычна Адамовіч прыязджаў на радзіму. Але ці надоўга ён затрымаецца ў Беларусі зараз, не ведае і сам.

"Я магу адрасаваць пытанне аб тым, як доўга я буду ў Беларусі, грамадскасці, — паведаміў "Народнай Волі" Адамовіч. — *Наколькі нашаму грамадству патрэбны такі паэт Славамір Адамовіч? Я пакуль тут, але што далей — не ведаю. Узнікае пытанне запатрабаванасці. Ці буду я яшчэ мець магчымасць выступаць у Мінску? Гэтае пытанне не толькі да мяне. Так жа можна звярнуцца да* ***Зянона Пазьняка****. Вось ён прыедзе — і што? Будуць яго тут слухаць ці не? Прынясе яму хто-небудзь кветкі? Таму і я не магу так адназначна адказаць — я тут ці не. Магу сказаць толькі, што ў мяне ў Беларусі назбіралася шмат спраў і на працягу года я буду вырашаць іх тут".*

Паэт пасталеў і ўжо не ладзіць палітычных гульняў з уладай. Сёння яго хвалююць больш спакойныя рэчы: выданне кніжкі і наладжванне адносін з дачкой, якая зусім нечакана знайшлася ў скандальнага паэта ў Беларусі.

Як высветліла "Народная Воля", дзяўчынцы ўжо 11 гадоў. Паэт не ведаў, што падчас яго вандровак па свеце ў беларускай правінцыі расце яго нашчадак. Варта адзначыць, што Адамовіч заўжды марыў аб дачцэ і нават прысвяціў сваёй мары верш. Так атрымалася, што некаторыя чалавечыя жаданні маюць звычай здзяйсняцца, і спадар Адамовіч даведаўся, што ўжо даўно бацька. Варта заўважыць, што 10—12 год таму паэт вельмі шмат раз'язджаў па Беларусі з творчымі вечарынамі. Не абмінаў і правінцыяльныя гарадочкі...

Сёння Адамовіч памяркоўна распавядае аб тым, як важна раздзяляць мастацтва і ідэалогію, і заклікае ганарыцца ўсімі творцамі, у тым ліку і небеларускімі. Пры гэтым Славамір Адамовіч канчаткова не перастае сачыць за палітыкай. Нягледзячы на сваю доўгую адсутнасць на радзіме, ён сфарміраваў сваё ўласнае меркаванне аб сённяшняй палітычнай сітуацыі Беларусі і добра арыентуецца ў спісе палітыкаў. Пажаданняў не агучвае, але не хавае таго, што калега па паэтычным цэху **Уладзімір Някляеў** яму падабаецца.

"Я добра стаўлюся да Някляева, — прызнаўся "Народнай Волі" Адамовіч. — *Ён разумны і адказны чалавек. Калі ў яго ёсць сілы і здольнасці, то ён можа займацца палітыкай. Тым больш паэт. У паэтаў, у адрозненне ад палітыкаў, ёсць вельмі моцная зброя — нефальшывае слова. Калі ў асобе Някляева палітык не пераважыць паэта, то ён можа дасягнуць многага".*

Марыя МАЛЕВІЧ.

НЕ ПРОПУСТИТЕ!

В Минск едут Нина Ананиашвили, Сонора Вайце и Зураб Соткилава

Народная артистка Грузии и России **Нина Ананиашвили** выступит на сцене Национального академического Большого театра оперы и балета 17 декабря. Она исполнит партию Одетты—Одиллии в балете "Лебединое озеро" П.Чайковского.

Партию принца Зигфрида исполнит **Васил Ахметели** — ведущий солист Тбилисского государственного театра оперы и балета им.З.Палиашвили.

А с 7 по 12 декабря в Театре оперы и балета состоится Минский международный Рождественский оперный форум, в рамках которого будут показаны лучшие спектакли Большого театра Республики Беларусь с участием ведущих солистов театра и приглашенных звезд мировой оперной сцены. Кроме того, впервые белорусские зрители увидят спектакли "Травиата" и "Севильский цирюльник" ведущих оперных театров — Латвийской Национальной Оперы и Московского театра Новая Опера им.Е.В.Колобова. Завершится оперный форум 12 декабря гала-концертом звезд мировой оперной сцены с участием лучших оперных солистов из Беларуси, России, Украины, Испании и Узбекистана.

Во время I Минского международного Рождественского оперного форума театр примет более 150 гостей из России, Литвы, Латвии, Азербайджана, Сербии, Испании, Узбекистана.

7 декабря в опере "Набукко" партию Захарии исполнит премьер оперы Сербии **Бранислав Ятич**, в партии Измаила выступит премьер мировой оперной сцены, знаменитый испанский тенор **Хорхе Пердигон**.

10 декабря Латвийская Национальная Опера представит нашумевшую постановку оперы "Травиата". В спектакле заняты ведущие солисты латвийской оперы — партию Виолетты Валери исполнит лауреат международных конкурсов **Сонора Вайце**, партию Альфреда Жермона — **Андрис Людвигс**, Жоржа Жермона — лауреат международных конкурсов **Самсон Изюмов**. Дирижер — **Нормундс Вайцис**.

12 декабря — гала-концерт звезд мировой оперы, в котором примут участие народная артистка СССР **Маквала Касрашвили** (Россия), народный артист СССР **Зураб Соткилава** (Россия), народная артистка России **Людмила Шемчук** (Россия), народный артист России **Владимир Маторин** (Россия), **Хорхе Пердигон** (Испания), народный артист Узбекистана **Аваз Раджабов** (Узбекистан), народные артисты Беларуси **Сергей Франковский**, **Владимир Петров**, заслуженная артистка Республики Беларусь **Нина Шарубина** и другие.

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

Ігар ЛУЧАНОК:

«Для таго каб стаць сусветна вядомымі, трэба напісаць «Танец з шаблямі»

Беларуская музыка перажывае не лепшыя часы. Папулярныя кампазіцыі "не чапляюць", а аб айчыннай класіцы амаль нічога не чуваць. Пры гэтым ужо 75 гадоў дзейнічае Беларускі саюз кампазітараў, які не толькі павінен аб'ядноўваць творчых людзей, а яшчэ і забяспечыць патрэбы беларусаў у якаснай музыцы.

Чаму маўчыць згуртаванне кампазітараў, высвятляла "Народная Воля".

Больш за пятнаццаць гадоў нязменным кіраўніком Саюза кампазітараў Беларусі з'яўляецца аўтар калісьці папулярных песень **Ігар Лучанок**. На апошнім з'ездзе, які адбыўся 19 лістапада і быў прымеркаваны да 75-годдзя Саюза, яго зноў безальтэрнатыўна абралі старшынёй, нягледзячы на сталы ўзрост. Па словах Лучанка, ён робіць усё магчымае для таго, каб дзейнасць аб'яднання прыносіла карысць, але шарагоўцы маюць іншае меркаванне. Шмат кампазітараў незадаволены існуючым парадкам, аб чым, не хаваючыся, заяўлялі і да з'езда, і падчас яго.

"Дзейнасць Саюза ніяк не ўплывае на жыццё шараговага кампазітара, — мяркуе сябра Саюза **Алесь Рашчынскі.** — *Няма для каго пісаць... Слухач, можа, і ёсць, але ён не запатрабаваны, як і кампазітар. Ёсць і канцэрты, але народ у асноўным валіць на расійскую папсу. Нацыянальная культура зараз "пад лаўкай", у своеасаблівай рэзервацыі. Улада аддае перавагу рускамоўнаму, савецкаму, безнацыянальнаму бескультур'ю. Саюз кампазітараў жыве як бы сам па сабе. У нас народ не скансалідаваны, і кожны кампазітар выжывае ў адзіночку".*

Цяжка разабраць, дзе абвінавачанні на адрас Саюза перацякаюць у скаргі на сучаснае жыццё. Безумоўна, каб выправіць сітуацыю, недастаткова проста павысіць ганарары для кампазітараў ці забараніць папулярную музыку. Калі на з'ездзе Лучанок распавядаў аб праблемах аб'яднання музыкаў, словы кшталту "папса", "нізкапробны", "спрошчаны", "прымітыўны" не сыходзілі з яго языка. А каб набыць сусветную папулярнасць, Лучанок параіў сваім калегам "*напісаць "Танец з шаблямі" Хачатурана*".

Цяжкасці ў распаўсюджванні і развіцці класічнай музыкі адчувае і ўрад. Міністэрства культуры зрабіла некалькі крокаў насустрач творцам. Так, напрыклад, будынак на Плошчы Свабоды, дзе знаходзіцца офіс Саюза, перададзены ва ўласнасць арганізацыі. Пры гэтым фінансавыя праблемы стаяць на першым плане. Нягледзячы на тое, што большасць членаў своечасова плаціць гадавыя ўнёскі ў памеры 35 тысяч беларускіх рублёў, за камунальныя паслугі Саюз павінен дзяржаве 10 мільёнаў рублёў. Два чалавекі, якія працуюць у Саюзе на палову стаўкі, некалькі гадоў не атрымліваюць заробак. За "дзякуй" працуе і кіраўнік Саюза.

"Я не атрымліваю заробак ужо вельмі даўно, — прызнаўся кампазітар "Народнай Волі". — *Я — Лучанок, Народны артыст Савецкага Саюза! І не буду, бо мне і не трэба. Грошы — гэта зло. Зараз часы змяніліся, і Міністэрства культуры зноў нам дапамагае. А я дапамагаю кампазітарам заўжды, чым толькі могу. А мне самому нічога не трэба".*

Шарагоўцы Саюза мысляць па-іншаму. Ім хацелася б не толькі, каб іх абаранялі і падтрымлівалі ў працы, але таксама і давалі падставы для творчага развіцця. З-за фінансавых праблем канцэрты беларускіх кампазітараў адбываюцца вельмі рэдка.

Міністр культуры **Павел Латушка** таксама прысутнічаў на з'ездзе і паабяцаў рознабаковую падтрымку для сябраў Беларускага саюза кампазітараў, але, падобна да таго, што шарагоўцы не вераць у шчырасць гэтых намераў.

"У нас выдатная кампазітарская школа, шмат выбітных твораў, моцная камерная музыка, — выказаўся Рашчынскі. — *У рэшце рэшт, у нас моцная еўрапейская музыка, якую ўлада не хоча прасоўваць. Так і атрымліваецца, што кожны сам па сабе. Бывае, што кагосьці надрукуюць за мяжой, тады і на радзіме ўганаруюць, але гэта бывае вельмі рэдка. А каб Саюз кагосьці вылучаў, гэтага я не ведаю".*

Знакаміты кампазітар **Уладзімір Кандрусевіч** салідарны з меркаваннем свайго сябра па Саюзе Алеся Рашчынскага. Уладзімір Пятровіч упэўнены, што калі сітуацыя не зменіцца, то аб аб'яднанні хутка ўвогуле перастануць гаварыць, арганізацыя проста знікне.

"Сёння Саюз — амаль мёртвая арганізацыя, — выказаў сваё меркаванне "Народнай Волі" Кандрусевіч. — *Раней, калі я толькі ўступіў у яго, гэта была зусім іншая арганізацыя. Там рэальна падтрымлівалі людзей, напрыклад, можна было перадрукаваць ноты. Калі на бліжэйшых з'ездах не будзе прынята пытанне аб зменах, то гэта будзе азначаць поўны крах".*

Сапраўды, на з'ездзе падымаліся розныя пытанні. Але большасць незадаволеных вераць толькі ва ўласныя сілы і змагаюцца самі. Быў і яшчэ адзін варыянт — шмат хто падыходзіў да міністра культуры і ў кулуарах прасіў дапамогі, грошай, выступленняў.

Яшчэ за некалькі месяцаў да з'езда "Народная Воля" звярталася ў Саюз з пытаннем, што ж будуць абмяркоўваць кампазітары, што іх хвалюе. Намеснік старшыні грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз кампазітараў" **Сяргей Бельцюкоў** раіў нам звяртацца за тлумачэннямі ці да Лучанка, ці да кагосьці, хто зможа адказаць на нашы пытанні. Бо, па яго словах, ён не надта сочыць за падзеямі ў Саюзе...

Такім чынам, рэальная дзейнасць Саюза застаецца па-за кулісамі. Відавочныя толькі тыя невялікія канцэрты, якія ладзяцца сябрамі Саюза. Частка з іх бясплатная і праходзіць непасрэдна ў памяшканні аб'яднання па адрасе: плошча Свабоды, 5. Іншыя адбываюцца ў філармоніі, і за іх ужо прыходзіцца плаціць.

Бяздзейнасць Саюза ўжо даўно не здзіўляе яго членаў. Некаторыя навучыліся атрымліваць ад такога супрацоўніцтва максімум выгад без нерваў і залішніх праблем. Маўляў, усе непрыемнасці — з-за натуральнай нескансалідаванасці творчых асоб.

"Лёсы бываюць рознымі, — з лагоднай усмешкай на твары распавяла "Народнай Волі" кампазітар і педагог **Эла Андрэенка**. — *Творчыя людзі могуць перабягаць адзін аднаму дарогу. Прыходзіцца неяк змагацца. Асабіста я змагаюся з усім толькі з дапамогай творчасці".*

Марыя МАЛЕВІЧ.

ДИПКУРЬЕР

Посол Франции едет на Березину

26 ноября Посол Франции в Республике Беларусь Мишель Ренери возложит венок к монументу на кладбище у деревни Студенка (Борисовский район — левый берег реки Березина), где в 2007-м и 2008 годах были перезахоронены останки солдат Армии Наполеона, погибших на белорусской земле.

Затем Посол отправится на Брилевское поле (около деревни Веселово — правый берег реки Березина), где возложит цветы к мемориальным памятникам и почтит память погибших в войне 1812 года. Памятное мероприятие завершится выступлением господина Посла на 2-й Международной научной конференции "Колодеевские чтения", организованной Борисовским районным исполнительным комитетом.

Посольство Франции надеется на активизацию двустороннего сотрудничества по подготовке 200-летнего юбилея переправы Армии Наполеона через Березину.

Алина ВЕТРОВА.

РАКУРС

Тамара ЛІСІЦКАЯ: *«Дамы ўжо не хаваюцца за словамі...»*

12 беларускіх пісьменніц і спявачак выступілі ў ролі мадэляў і зняліся ў аголенай фотасесіі для календара, які напрыканцы года выпусціць студыя Excellent.

"Каляндар рамантычны і адкрыты, — напісала ў сваім інтэрнэт-дзённіку адна з удзельніц праекта, тэлевядучая і пісьменніца **Тамара Лісіцкая**. — *Дамы ўжо не хаваюцца за словамі. Яны адкрытыя не толькі ў тэкстах. І не толькі душа агаляецца... Гэта як бы і свавольства, і крок, і таксама грань, і какецтва, і адвага, і тое, што хоць раз у жыцці абавязкова павінна зрабіць жанчына..."*

Акрамя Тамары Лісіцкай у праекце прынялі ўдзел **Віка Трэнас, Дзіяна Балыка, Наталля Батракова, Вольга Тарасевіч, Валерыя Кустава, Ганна Альхоўская, Святлана Бень, Алена Ярмаловіч, Вольга Гапеева і Вольга Акуліч.**

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.

ПОСТСКРИПТУМ

Расчетливый ход?

В предыдущем номере "Народной Воли" в заметках Семена Букчина "Одиночество бунтаря", приуроченных к 100-летию со дня смерти Льва Толстого, говорилось об игнорировании этой даты на государственном уровне в России, в известной степени, как считает автор, связанном с не отмененным до сих пор постановлением Синода русской православной церкви, осуждающим писателя и исключающим его из ее "членов".

Так получилось, что в день сдачи этого номера в печать к Патриарху Московскому и всея Руси Кириллу обратился с письмом Сергей Степашин, но не в качестве главы Счетной палаты, а как президент Российского книжного союза. С массой всевозможных оговорок ("особая чувствительность этой темы", "невозможность для Русской православной церкви пересмотреть решение об отлучении Льва Толстого от церкви") г-н Степашин почтительнейше просил Патриарха хотя бы *"разъяснить позицию Церкви в этом вопросе"*, публично проявить *"в той или иной форме чувство сострадания со стороны Церкви к великому писателю в канун скорбной даты, по мнению Российского книжного союза, были бы сегодня правильно восприняты православным сообществом и обществом в целом".*

Патриарх Кирилл как истинно мудрый человек, конечно же, понимал, что не стоит ему влезать в эту историю. Сказать, что действительно постановление Синода 1901 года было мракобесным и сегодня его необходимо пересмотреть, он, при всей своей культуре и либерализме, не мог. Но и пойти на подтверждение правильности того же постановления для него означало войти в историю с темным пятном осудителя великого писателя. Поэтому умный человек Патриарх Кирилл поручил (благословил) дать ответ ответственному секретарю Патриаршего совета по культуре, наместнику московского Сретенского монастыря архимандриту Тихону (Шевкунову).

Архимандрит Тихон, что называется, не подкачал, проявил истинно советскую идеологическую выучку. Во всяком случае в советские годы экзамен по литературе он бы сдал на отлично. Поскольку четко заявил в своем письме, что *"деятельность Л.Н.Толстого в последние десятилетия его жизни, к сожалению, была поистине разрушительна для России... Она принесла несчастье народу, которому он так хотел служить".* Ну и, натурально, архимандрит, как и положено было в те времена, сослался на "вождя большевиков", подчеркнув, что тот *"чрезвычайно ценил именно это направление деятельности Л.Н.Толстого и называл писателя "зеркалом русской революции".* Пригодился, наконец, церкви и Ленин.

В общем, *"отлучение снято быть не может"* и *"церковное поминовение его невозможно".* Хотя, оговаривается архимандрит Тихон, *"несколько поколений православных читателей в нашей стране и за рубежом высоко ценят литературное творчество Л.Н.Толстого".* И далее дается строгий список тех "незабываемых, прекрасных произведений", которые следует чтить "православному читателю". Это "Детство", "Отрочество", "Юность", "Хаджи-Мурат", "Война и мир", "Анна Каренина", "Смерть Ивана Ильича". Точка. Роман "Воскресение", естественно, в этот список "рекомендованной литературы" не входит. Ну как же! Ведь, собственно, роман этот, в котором выведен образ обер-прокурора Синода Топорова, *"человека тупого и лишенного нравственного чувства",* и стал настоящей причиной отлучения Толстого. Читатели узнали в нем тогдашнего реального обер-прокурора Синода К.П.Победоносцева, того самого, который, по выражению Блока, "*над Россией простер совиные крыла".*

Можно по-разному относиться к роману "Воскресение". Но почему церковь считает возможным покушаться на право художника изображать мир и людей такими, какими он их видит? Вы осуждаете Толстого за обвинение Топорова в безверии, за кощунственные слова о страсти народа к "грубому идолопоклонству" и суевериям? Тогда осудите и Вольтера, и Свифта, и Шекспира, и Гейне! Осудите всю мировую литературу, культуру, философию! Потому что высшие их достижения связаны с бунтом против ханжества, угодливой морали, фальши.

Но эти "ужасные претензии" не для г-на Степашина. Г-ну Степашину довольно и того, что Московская Патриархия снизошла до того, что похвалила художественный талант Льва Толстого. И вот он уже кланяется и благодарит: "Спасибо, спасибо отцам нашим и учителям!"

Г-н Степашин считает свою задачу выполненной. Церковь показала, что она спустя сто лет после смерти великого писателя **не совсем отвергает его.** Прогресс налицо. Кто теперь будет говорить о почти средневековом решении Синода, протянувшемся в XXI век? Такое ощущение, что г-н Степашин выполнил заказ по некоторому обелению церкви, возможно, согласованный с чуть ли не Администрацией президента России. Кому как не председателю Счетной палаты и рассчитать такой ход?

Степан ВЛАДИМИРОВ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
23—25 ЛІСТАПАДА 2010 г.

Ізноў 25...

Чыноўнікі лічаць, што заваяванне 25 медалёў на Алімпійскіх гульнях у Лондане — выканальная задача

Пра гэта заявіў міністр спорту і турызму Беларусі Алег Качан, адкрываючы алімпійскі прэс-цэнтр "Лондан-2012".

Задача, можа, і выканальная, але пакуль недасяжная для беларускіх спартсменаў. Увогуле планаванне заваявання ўзнагарод у спорце — рэч няўдзячная. Пра гэта сведчыць і гісторыя выступленняў беларускіх алімпійцаў. Так, на Алімпіядзе ў Афінах у 2004 годзе беларускія атлеты заваявалі 15 узнагарод, а праз чатыры гады ў Пекіне, дзе ім таксама ставілі задачу прывезці 25 медалёў, — 19 узнагарод.

І вось ізноў 25... Гэтая лічба была агучана Аляксандрам Лукашэнкам яшчэ напярэдадні пекінскай Алімпіяды. Паўтарыў яе Аляксандр Рыгоравіч і на Алімпійскім сходзе ў красавіку: "Я ж не прашу ў вас 100 медалёў на Алімпіядзе — 25. 25 — мы за гэтую лічбу павінны ўчапіцца, гэта для нас святая лічба павінна быць. І больш прасіць не буду. Хай будзе 25 медалёў — 5 з іх залатыя. Гэта будзе верх".

Дарэчы, і пяці залатых медалёў на летніх Алімпійскіх гульнях беларусы не заваёўвалі пакуль ніколі; лепшы вынік быў у Пекіне — 4 залатыя ўзнагароды.

На сённяшні дзень кандыдатамі ў алімпійскую зборную Беларусі з'яўляюцца 353 спартсмены ў 31 відзе. Першыя алімпійскія ліцэнзіі заваявалі беларускія стралкі — Сяргей Мартынаў і Вікторыя Чайка. Па словах трэнера зборнай Беларусі па стральбе Ігара Басінскага, усяго стралкі плануюць заваяваць тры-чатыры ліцэнзіі, а на Алімпіядзе ў Лондане заваяваць два медалі.

Чым беларускіх алімпійцаў зацікавіць дзяржава? Не апошнюю ролю ў гэтым пытанні будзе мець і фінансавы стымул для спартсмена. Ужо зацверджаны памеры прызавых для беларускіх алімпійцаў. Уладальнік залатога медаля лонданскай Алімпіяды атрымае 150 тысяч долараў. За сярэбраную ўзнагароду ўсталяваны ганарар у 75 тысяч, за бронзавую — 50 тысяч долараў.

Акрамя таго, зацверджана палажэнне аб імянных стыпендыях для беларускіх спартсменаў.

У сваю чаргу першы віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі Ігар Заічкоў адзначыў, што працэс падрыхтоўкі да лонданскай Алімпіяды знаходзіцца пад кантролем Аляксандра Лукашэнкі і Міністэрства спорту: "Ніхто і не кажа, што ўсё гладка. Ёсць праблемы з пэўнымі камандамі і спартсменамі па інвентары і фармакалогіі, але мы стараемся іх вырашаць".

Да Алімпіяды ў Лондане яшчэ ёсць час, і, магчыма, медальны план будзе скарэктаваны. Усё будзе залежаць ад таго, у якіх алімпійскіх відах спорту беларусы заваююць ліцэнзіі.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

...Іх эмоцыі не ведалі межаў

Вікторыя Азаранка...

Яе чакалі ў Мінску не адзін год. І, нарэшце, з'явілася! Не адна, а са сваёй сяброўкай, першай ракеткай свету датчанкай Каралін Вазняцкі.

Не, гэта быў не афіцыйны турнір тэнісных зорак. Гэта быў парыў іх душы! Каралін адгукнулася на прапанову Вікторыі правесці дабрачынны матч на яе радзіме. Перад гульнёй зоркі сусветнага тэнісу пабывалі ў дзіцячым анкалагічным цэнтры, што ў Бараўлянах, правялі майстар-клас для юных спартсменаў і аўтограф-сесію для прыхільнікаў.

Што да матча, то ён атрымаўся даволі прыгожым. Як і самі дзяўчаты! Іх эмоцыі ў гэты дзень, здаецца, не ведалі межаў.

Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ:
«Гатовы выступаць хоць сёння»

Беларускі штурхальнік молата Вадзім Дзевятоўскі рыхтуецца да Алімпіяды-2012 у Лондане.

Нагадаем, што на Алімпійскіх гульнях-2008 у Сіднеі Дзевятоўскі заваяваў сярэбраны медаль, але рашэннем Міжнароднага алімпійскага камітэта быў пазбаўлены ўзнагароды і дыскваліфікаваны пажыццёва. Падставай для такога суровага рашэння стала тое, што Дзевятоўскі быццам бы ўжываў допінг.

Амаль два гады спатрэбілася беларусу і ягоным адвакатам для таго, каб даказаць сваю невінаватасць. У чэрвені бягучага года Спартыўны арбітражны суд у сувязі з парушэннямі, якія былі дапушчаны пры правядзенні допінг-пробы, сваім рашэннем вярнуў Дзевятоўскаму алімпійскі медаль.

У Беларусі гэтае рашэнне вырашылі адзначыць па-свойму — у мінулую суботу ў Віцебску была адкрыта стэла з імянным медалём Вадзіма Дзевятоўскага.

"Так атрымалася, што свой медаль Вадзім Дзевятоўскі заваёўваў двойчы. І толькі яму вядома, у які раз гэта было цяжэй", — адзначыў на адкрыцці стэлы начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама Міхаіл Партны.

Сам Вадзім Дзевятоўскі сказаў, што ўжо рыхтуецца да выступлення на будучай Алімпіядзе ў Лондане, праўда, пакуль не вядома, у якіх афіцыйных спаборніцтвах ён возьме ўдзел.

"Я гатовы выступаць хоць сёння, але не хацелася б адразу пасля гэтага завяршыць кар'еру. Трэба сканцэнтравацца на падрыхтоўцы да Лондана і зрабіць усё магчымае дзеля заваявання алімпійскага медаля".

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

КРИК ДУШИ

Было стыдно...

Как Вы думаете, какие массовые спортивные соревнования ежемесячно собирают наибольшее число участников в основном школьного возраста? При всем моем уважении ко всем видам спортивных увлечений — это не хоккей, не велоспорт и даже не художественная гимнастика! Это спортивные единоборства, увлечение которыми стало массовым практически во всех регионах. К ним относится бесконтактное карате, которое на разных турнирах одновременно собирает многие сотни юных участников, не говоря уже об их родителях и просто болельщиках. Которые без всяких принуждений и разнарядок просто приходят активно поболеть. Кроме того, такой вид спорта не просто развивает юных спортсменов физически, организует их досуг на постоянной основе за счет регулярных тренировок, но и имеет прекрасную философскую составляющую, основанную на уважении к сопернику и окружающим.

Общепризнаны успехи белорусских представителей спортивных единоборств на международной арене, где они пользуются заслуженной популярностью и уважением.

Казалось бы, соответствующим спортивным функционерам и "флаг в руки" для развития этого массового движения. Не требуется дорогостоящей амуниции для спортсменов, как, например, в хоккее. Спортивная экипировка доступна каждому желающему. Энтузиазма и желания у участников хоть отбавляй. Нужно хотя бы на время соревнований предоставлять им подходящие спортивные залы, коих на деньги налогоплательщиков настроено уже достаточно. Тем более что все юные участники за каждый турнир (а их за год проходит около десятка) исправно уплачивают регистрационный взнос (примерно по 50.000 рублей на участника за каждый).

Что же происходит на деле? 14 ноября 2010 года в прекрасном спортивном комплексе "Минск-Арена" проходил открытый республиканский турнир — осеннее первенство республики по карате. Сказать, что было стыдно за организаторов турнира, — это ничего не сказать. На соревнования приехали более 400 участников из всех регионов республики. И для проведения этого турнира нашли возможность выделить в подвальном помещении комплекса только маленький зал с тремя площадками — татами. От духоты, жары и спертого воздуха многим участникам периодически становилось плохо. Из-за недостатка естественного освещения вверху включили мощные лампы накаливания, при этом систему кондиционирования отключили в целях экономии, так как собранных участниками двух десятков миллионов рублей не хватило на полноценную аренду с кондиционированием! И это при том, что рядом на пустом велотреке катались несколько спортсменов (которым денег на аренду, очевидно, хватило), не говоря уже о других спортивных сооружениях. Этажом выше, в зале большего размера, десяток спортсменов играли в баскетбол (тоже денег хватило). Соревнования закончились к полуночи, добавив участникам ко вкусу победы горький привкус. Неужели чиновники от спорта, наделенные правом принятия решений, на самом деле не видят массовых увлечений или просто не хотят в них разобраться? Массовый спорт не должен быть уделом избранных!

Только тихо завидуешь спортсменам, например, в Смоленске, Киеве, Одессе, где приходится бывать на выездных турнирах. Да, у них еще нет такого количества замечательных хоккейных дворцов, как у нас, но к своим юным спортсменам они относятся с уважением. И стараются создавать для них достойные условия для занятия любимым делом.

С уважением —

Юрий Петрович КУЛИКОВ, отец одного из спортсменов, постоянный читатель "Народной Воли".

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Марек СИКОРА:
«Когда у меня выходной, стараюсь вообще не думать о спорте»

Главный тренер минского «Динамо», чешский специалист Марек СИКОРА рассказал на пресс-конференции журналистам

О выступлении

— Я доволен положением команды. 40 набранных очков — вполне хороший результат. Еще перед началом сезона я говорил, что опасаюсь промежутка с середины октября до конца ноября. Слава Богу, эта затяжная выездная серия пока проходит довольно неплохо.

О новичках

— Вы уже знаете, что "Динамо" подписало Петра Сикору. Этот нападающий начинал играть у меня. Когда Петру было 16 лет, я привлек его во взрослую команду. Потом во время локаута в НХЛ Петр выступал у меня в "Магнитке". Я отлично знаю этого форварда. Он забивной хоккеист, всегда нацеленный на ворота. Я рассчитываю усилить Петром второе звено, которое при нем сможет давать результат. В большинстве планирую использовать Сикору в роли четвертого нападающего на позиции защитника в первом звене. Сикора, безусловно, хоккеист высочайшего уровня. Единственное, меня беспокоит его состояние — у него было много повреждений в последнее время. Правда, насколько мне известно, в его контракте есть пункт, в соответствии с которым при рецидиве травмы соглашение автоматически расторгается. Также я очень хочу пригласить в команду Михаила Стефановича. Больше новичков, пожалуй, не будет. Все-таки финансовые возможности нашего клуба не резиновые.

О свободном времени

— Когда у меня выходной, я стараюсь вообще не думать о спорте. Не смотреть его по телевизору, не читать о нем. Хотелось бы как-нибудь выкроить пару дней и поездить с женой по историческим местам Беларуси.

О будущем

— Не знаю, станет ли этот сезон для меня последним в карьере. Думаю, это будет зависеть от результата "Динамо". Если нас постигнет неудача, то я скорее всего завершу тренерскую карьеру. Если выступим успешно, то, наверное, продолжу работать. Что для меня успех? Выход в плей-офф и прохождение первого раунда.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

ЗАКУЛИСЬЕ

По политическим мотивам

Матч чемпионата Испании по футболу между "Барселоной" и мадридским "Реалом" перенесен с воскресенья, 28 ноября, на понедельник, 29 ноября, сообщает официальный сайт Профессиональной футбольной лиги Испании.

Это решение принято из соображений безопасности, так как 28 ноября в Каталонии пройдут парламентские выборы. Барселона, где состоится игра, является столицей провинции.

В Каталонии традиционно сильны сепаратистские настроения, а футбольный клуб "Барселона" считается многими одним из символов борьбы за независимость от Испании. Самым принципиальным соперником "Барселоны" является именно "Реал".

В парламентских выборах Каталонии примет участие, в частности, партия Жоана Лапорты, который с 2003-го по 2010 год был президентом "Барселоны". Свою партию он организовал после ухода с поста президента клуба. Лапорта является сторонником независимости Каталонии от Испании.

Лыжные гонки — на Красной площади?

Президент Федерации лыжных гонок России Елена Вяльбе заявила, что в сезоне-2011/12 на Красной площади в Москве может пройти спринтерская гонка.

По словам Вяльбе, пока это только проект. Об этом пишет газета "Спорт-Экспресс". Когда именно может состояться гонка на Красной площади, не уточняется.

Накануне директор Международной федерации лыжных видов спорта по лыжным гонкам Йорг Каполь заявил, что есть три возможных места проведения спринтерской гонки в Москве. Один из вариантов — Красная площадь.

Какой статус будет носить гонка, не сообщается, однако, по данным "Спорт-Экспресса", в сезоне-2011/12 статус этапа Кубка мира она не получит.

Доигрался

Вратарю московского ЦСКА Вениамину Мандрыкину, выступающему на правах аренды за брянское "Динамо", сделана операция в связи с переломом позвоночника.

Футболист получил травму в автомобильной аварии в ночь на 10 ноября. По словам врачей брянской городской больницы, операция прошла "планово", сообщает "Спорт-Экспресс".

29-летний Мандрыкин попал в аварию, находясь за рулем своего автомобиля Porsche Cayenne. Вратарь ехал на высокой скорости, сотрудники милиции подали ему знак остановиться, однако футболист продолжил движение. Милиционеры начали преследовать Мандрыкина, он не справился с управлением и врезался в дерево, после чего автомобиль перевернулся.

Игрока доставили в больницу, где врачи зафиксировали у него перелом позвоночника и повреждение спинного мозга. Вместе с Мандрыкиным в машине находились две девушки 19 и 20 лет. Одна из них получила перелом грудного отдела позвоночника, другая сломала ключицу.

Клинтон презентует

Презентацию заявки США на проведение чемпионата мира по футболу 2022 года проведет бывший американский президент Билл Клинтон. Об этом сообщает "Ассошиэйтед Пресс".

Презентация состоится 1 декабря 2010 года в Цюрихе — за день до голосования членов исполкома ФИФА, по итогам которого будет выбрана страна — организатор турнира.

В мае 2010 года Клинтон стал почетным президентом американского заявочного комитета. Летом 2010 года Клинтон присутствовал на чемпионате мира в ЮАР. Там бывший президент США посетил два матча сборной своей страны, а также встретился с несколькими членами исполкома ФИФА.

В США уже проходил чемпионат мира по футболу. Первенство планеты в этой стране состоялось в 1994 году, когда Клинтон занимал пост президента.

На проведение ЧМ-2022, помимо США, претендуют Катар, Австралия, Япония и Южная Корея. 2 декабря ФИФА также определит страну — организатора ЧМ-2018. За право провести этот турнир борется, в частности, Россия.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск,
вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл./факс
(017) 3286871.
Тэл./факс
рэкламнага
аддзела: (017)
3286904, 3286906
E-mail :
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

ISSN 2071-9647
9 772071 964000 10184

Падпісныя індэксы: 63222,632222

Заснавальнік
і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч
СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 22.11.2010 у 18.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 23350 экз. Заказ №5688.